

БРЭКЕТЫ: ПРЫГАЖОСЦЬ ЦІ ПАКУТА? 7

ПАДАРУНКІ ЧЫТАЧАМ АД «ЗВЯЗДЫ» 11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

20 СТУДЗЕНЯ 2021 г. СЕРАДА № 10 (29379)

ЦЫТАТА ДНЯ

Руслан ПАРХАМОВІЧ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:

«Адным з кірункаў жыллёвай палітыкі будзе развіццё гарадоў-спадарожнікаў і прынцып зваротнай міграцыі насельніцтва ў малыя і сярэднія гарады. Прычына досыць банальная — чым большы горад, тым больш у ім чарга маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у тым ліку шматдзетных сем'яў. Плануецца прапаноўваць грамадзянам, якія нядаўна былі прынятыя на ўлік маючых патрэбу і якім трэба будзе ў абласным цэнтры стаяць у чарзе яшчэ гады, палепшыць свае жыллёвыя ўмовы без чаргі ў малых і сельскіх населеных пунктах, колькасць жыхароў якіх не перавышае 20 тысяч. Пры гэтым іх права на атрыманне дзяржпадтрымкі будзе захавана ў абавязковым парадку».

КАРАТКА

- У Беларусі пачалі прышчапляць ад каранавіруса медработнікаў, якія знаходзяцца ў зоне рызыкі.
- **Маршруты цягнікоў гарадскіх ліній з Мінска працягнуты за Дзяржынск і Смалявічы.**
- Гродзенскія мытнікі ў 2020 годзе спынілі каля 100 фактаў незаконнага правозу грошай.
- **У Віцебскім заапарку папаўненне: тут 16 студзеня нарадзілася маленькая лама.**

- Каля 13,5 тоны елак ужо забралі з дваroў Мінска пасля свят на перапрацоўку.

ISSN 1990 — 763X

Паехалі разам!..

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З мінулага тыдня ў Стоўбцах працуе грамадскі каток для ўсіх ахвотных пакатацца на лёдзе. Вось і маладыя жыхары горада Аляксандра ШАЎЧУК, Яўген СЯДЛІЦКІ, Надзея КРАЙКОВА, Арцём ФЕДЗІЧКІН і іншыя таксама не ўпускаюць цудоўнага надвор'я і зручнага моманту пакатацца, тым больш што тут працуе і пракат сучасных канькоў.

У цэнтры ўвагі

АБРЫСЫ ГАЛОЎНЫХ ЗАДАЧ

Рэгіянальнае развіццё, рост даходаў і спрыяльнае асяроддзе для бізнесу

Фота БелТА.

Асноўныя палажэнні праекта Праграмы развіцця на пяцігоддзе прэзентавалі ў Міністэрстве эканомікі. Па сутнасці, гэта абрысы Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2021—2025 гады, якія будуць разгледжаны на Усебеларускім народным сходзе.

У ФАРМАЦЕ ФАРСАЙТАЎ

Як растлумачыў **міністр эканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ** на прэс-прэзентацыі, у падрыхтоўцы дакумента былі задзейнічаны эксперты па кожным з кірункаў сацыяльнай і эканамічнай частак будучай Праграмы, якія рабілі акцэнт на вопыце практыкаў і прапановах бізнесу. Дарэчы, у распрацоўцы былі задзейнічаны таксама навукоўцы профільнага інстытута Мінэканомікі, Нацыянальнай акадэміі навук, адукацыйныя ўніверсітэты, эксперты даследчых цэнтраў ІПМ і БЕРОК, прадстаўнікі Саюза прадпрымальнікаў, прыватных установ адукацыі, медыцынскіх цэнтраў і іншыя. Работа, сапраўды, была карпатлівай: пачынаючы з 2019 года ў фармаце фарсайтаў выпрацоўваліся стратэгічныя кірункі развіцця краіны. Галіновыя кірункі далей адпрацоўваліся непасрэдна з бізнесам і профільнымі міністэрствамі: эканомікі, працы і сацыяльнай абароны, жыллёва-камунальнай гаспадаркі і будаўніцтва і архітэктуры.

СТАР. 5

Нашы людзі

«АТАМНАЕ» ЖЫЦЦЁ І РАБОТА «Ў СПАДЧЫНУ»

Сяргей ГОРЫН — пра асаблівасці «рэактаршчыкаў», сімвалізм і звычку да адказнасці

СТАР. 6

9 771990 763008 21010>

З першых вуснаў

«ШТО Ж МЫ ПАЛІМ ІМПАРТНЫ РЭСУРС, КАЛІ Ў САМІХ ПАД НАГАМІ РЭСУРС ВЕЛІЗАРНЫ?»

Беларусь у ацяпленні дамоў будзе пераходзіць ад газу да мясцовых аднаўляльных відаў паліва

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам віцэ-прэм'ера Аляксандра Субоціна і міністра лясной гаспадаркі Віталя Дрожжу. Кіраўніку краіны расказалі пра леташнія вынікі работы ў галіне, якую Прэзідэнт назваў асноўнай, фундаментальнай, адной з базавых у эканоміцы, і аб кірунках яе развіцця на будучыню.

«Пры падрыхтоўцы да гэтага мерапрыемства я выявіў цікавыя факты. Насельніцтва наша наўрад ці ведае, што амаль 40 працэнтаў тэрыторыі Беларусі пакрыта найкаштоўнейшым аднаўляльным рэсурсам. І за гады нашай незалежнасці мы павялічылі плошчу зялёнага багацця амаль на мільён гектараў», — сказаў Прэзідэнт, дадаўшы: гэта сведчанне таго, што **«мы не драпежнікі, і да прыроды, і да рэсурсу, які даравaў нам Гасподзь, адносімся па-чалавечы».**

Запас драўніны на кані дасягнуў амаль двух мільярдаў кубічных метраў, доля спелых лясоў і перастойных дрэвастояў — больш за 20 % ад агульнага запасу. Але галоўнае, адзначыў Аляксандр Лукашэнка, — аднавілі тое, што страцілі ў савецкі час, калі дзелавую драўніну гналі за межы краіны, а адтуль прывозілі мэблю. Тады доля спелых лясоў складала тры працэнты, сёння — 20.

Лясная галіна працуе стабільна, нягледзячы на эпідэмічную сітуацыю.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў апошнія гады шмат лясных масіваў было высечана у межах барацьбы з караедам. Вялікія аб'ёмы драўніны, якія маглі за некалькі гадоў згніснуць, складзіравалі. Каб папярэдзіць гэта, былі пабудаваныя пелетныя заводы, якія сталі вырабляць альтэрнатыўнае паліва. «Як вы дакладваеце, усё (пелетнае паліва. — **«Зв.»**) закантрактавана, і нашы пелетныя прадпрыемствы выйшлі на прыбытак», — сказаў Прэзідэнт.

«Усяго пабудуем да 15 заводаў, а далей будзем глядзець. Запыт на гэту прадукцыю будзе заўсёды. **Гэта выгадная для нас прадукцыя. Навошта, каб нізкаякасная драўніна гніла ў лесе? Мы яе перапрацуем у паліва і з высокай рэнтабельнасцю прададзім»,** — дадаў кіраўнік краіны.

Паводле яго слоў, у такой прадукцыі зацікаўлены не толькі еўрапейскія пакупнікі, але і самім неабходна закрываць патрэбу.

«Трэба дакладна вызначыцца, колькі нам неабходна шчэпак, пелетаў, каб замясціць для ацяплення прыродны газ. Што ж мы палім імпартны рэсурс, калі ў самім пад нагамі рэсурс велізарны?» — задаў рытарычнае пытанне Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што цалкам падтрымлівае прапанову вызначыць на перспектыву, колькі будуць нарыхтоўваць драўніны для ўнутраных патрэб.

«Мы павінны ацяпляць дамы людзей, гарады, аграгарадкі, вёскі дровамі. У нас хапае гэтага аднаўляльнага рэсурсу. **Такім чынам мы зможам скараціць спажыванне прыроднага газу, за які мы плацім вялікія грошы»,** — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік краіны адзначыў: добры паказчык, што галіна прыносіць у два разы больш даходаў, чым атрымлівае з бюджэту грошай на развіццё. «Гэта тое, аб чым мы марылі гадоў 15-20 таму назад», — рэзюмаваў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт анансаваў вялікую нараду па развіцці лясной прамысловасці.

Марыя ДАДАЛКА.

ДАВЕДКА

Паводле інфармацыі прэс-службы Мінлясгаса, агульная плошча зямель лясного фонду за апошнія пяць гадоў павялічылася на 1,4 % і склала 86 %. Агульная плошча пакрытых лесам зямель пашырылася на 74 тысячы гектараў і складае 8 мільёнаў 300 тысяч гектараў. Лясістасць краіны блізкая да аптымальнай (больш за 40 %). У мінулым годзе паступленні ад вядзення лясной і паляўнічых гаспадарак склалі 460 мільёнаў рублёў. Стратныя арганізацыі ў галіне адсутнічаюць.

Адзін з найважнейшых кірункаў лесагаспадарчых устаноў — забеспячэнне перапрацоўшчыкаў драўнінай. У 2020 годзе арганізацыямі міністэрства нарыхтавана больш за 21 мільён кубаметраў драўніны. Летась, згодна з даручэннем Прэзідэнта, уведзены ў эксплуатацыю сем вытворчасцяў па выпуску паліўных гранул у Барысаўскім, Навагрудскім, Пружанскім, Клічаўскім, Жыткавіцкім, Капыльскім і Мазырскім раёнах. Працягваецца работа па стварэнні новых пелетных заводаў у Ганцавіцкім, Смаргонскім, Асіповіцкім і Старадарожскім раёнах.

❍ Каментарый у тэму

Па словах **міністра лясной гаспадаркі Віталя ДРОЖЖЫ,** галіна спрацавала па выніках года ў гістарычным максімуме па экспарце прадукцыі. У галіне адсутнічаюць стратныя арганізацыі, і эканамічны складнік дадатны. Дасягнуць значных вынікаў, як канстатаваў кіраўнік ведамства, удалося дзякуючы павелічэнню перапрацоўкі драўніны, стварэнню адпаведных вытворчасцяў, рэалізацыі інвестыцыйных праектаў.

«Прэзідэнтам пастаўлена задача прадоўжыць работу па прыцягненні ў абарот драўніннага рэсурсу, які маецца ў нашай краіне, працягнуць работу па стварэнні нашых вытворчасцяў па выпуску паліўных пелет. Плюс да гэтага Прэзідэнт паставіў задачу перагледзіць яшчэ раз выкарыстанне мясцовых відаў паліва», — паведаміў журналістам пасля сустрэчы Віталь Дрожжа.

Ён адзначыў, што ў найбліжэйшы час будуць перагледжаны падыходы да выкарыстання газу — то-бок ацяпляцца будзем не газам, а мясцовымі аднаўляльнымі відамі паліва. «У найбліжэйшы час мы палічым мэтазгоднасць пераходу з газу на шчэпкі, пелеты, брыкеты і адпаведнае рашэнне будзе», — сказаў міністр.

Віталь Дрожжа паведаміў, што ўдалося вырашыць і праблему з жуком-караедам: за тры гады плошчы хворых лясоў паменшыліся ўтрая.

Ва ўрадзе

ПАМНОЖЦЕ НА 30

Прэзідыум Савета Міністраў разгледзеў праект праграмы развіцця электратранспарту ў Беларусі на наступныя пяць гадоў, згодна з якім доля грамадскага электратранспарту павялічыцца ў 30 разоў.

Дакумент распрацаваны Нацыянальнай акадэміяй навук па даручэнні ўрада пасля адпаведнага распараджэння кіраўніка дзяржавы. Штуршком для работы вучоных стала наведванне Прэзідэнтам палігону Інстытута машынабудавання НАН для выпрабавання мабільных машын у маі мінулага года.

— Нікога не трэба пераконваць у тым, што развіццё электратранспарту — гэта сучасная тэндэнцыя, ад якой нельга сысці, яна сама ўваходзіць у наша жыццё, — заўважыў **прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА** ў пачатку пасяджэння Прэзідыума. — Для нашай краіны гэта актуальна яшчэ і з прычыны ўводу ў эксплуатацыю Беларускай атамнай станцыі.

У адпаведнасці з даручэннем урада Нацыянальная акадэмія навук Беларусі сумесна з зацікаўленымі распрацавала і ўнесла праект пастановы Савета Міністраў аб комплекснай праграме развіцця электратранспарту ў Рэспубліцы Беларусь на 2021—2025 гады.

Праект праграмы нараджаўся няпроста, і дагэтуль маюцца розныя погляды, у першую чаргу, у частцы пазіцыі абласных выканаўчых камітэтаў па закупцы электратранспарту, прызнаўся Раман Галоўчанка.

Ён заўважыў, што ў краіне ўсяго каля 5,5 тысячы адзінак грамадскага транспарту, які выконвае рэгулярныя пасажырскія перавозкі. Агульны парк аўтобусаў складае каля 32 тысяч адзінак. Маецца таксама распараджэнне кіраўніка дзяржавы ад 1 ліпеня 2020 года, у якім вызначаны індыкатыўныя паказчыкі па аднаўленні пасажырскага грамадскага электратранспарту, які выконвае рэгулярныя пасажырскія перавозкі для абласцей і горада Мінска, у аб'ёме амаль 2600 адзінак.

«Хацелася б пачуць, як плануюць вобласці і горад Мінск забяспечыць выкананне гэтага распараджэння кіраўніка дзяржавы», — звярнуўся ён да ўдзельнікаў пасяджэння.

Яшчэ адна праблема, звязаная з развіццём электратранспарту, — утылізацыя акумулятарных батарэй, якія адпрацавалі сваё.

Раман Галоўчанка падкрэсліў, што на пасяджэнні Прэзідыума неабходна абмеркаваць усе праблемныя пытанні і прыняць сістэмнае рашэнне аб развіцці ўсёй сферы электратранспарту па найбольш запатрабаваных кірунках. Ён у свой час патрабаваў, каб праграма атрымалася сапраўды комплексная — ад навуковых даследаванняў і распрацовак да стымуляцыйных мер па вытворчасці, набыцці і эксплуатацыі электратранспарту.

Старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ, які прадстаўляў праект, сказаў журналістам, што, на яго погляд, атрымаўся добры, зладжаны і збалансаваны дакумент, які вырашае комплекс пытанняў у галіне стварэння не толькі розных відаў электратранспарту (грамадскі, грузавы, персанальны, спецыяльны), але ўсёй інфраструктуры (заправачныя сеткі), кампанентнай базы (размяшчэнне вытворчасцяў). Праграма таксама ўтрымлівае навуковае забеспячэнне і пытанні па стандартызацыі і сертыфікацыі аўтамабіляў і іх складнікаў.

«Праграма своечасовая, комплексная, адпрацаваная з рознымі міністэрствамі і ведамствамі. Акрамя таго, яна з'яўляецца базавай, — дадаў ён. — Яна адкрывае шырокія магчымасці для развіцця асобнай галіны машынабудавання — электратранспарту. І яна ўжо рэалізуецца, бо складаецца з цэлага шэрагу праграм Міністэрства транспарту і камунікацый, «Белнафтахіма», іншых міністэрстваў і ведамстваў».

Уладзімір Гусакоў нагадаў, што «БелДЖЫ» збіраецца выпусціць 1000 электрамабіляў для персанальнага карыстання. Зараз, па словах акадэміка, у Беларусі налічваецца 1600 адзінак легкавога электратранспарту.

«Мяркуем, што ў найбліжэйшыя гады іх стане дзясяткі тысяч, — сказаў ён. — Патрабуюцца заправачныя станцыі. Мы арыентуемся тут на Еўропу, а ў Нарвегіі ўжо 50 % ад усяго транспарту складае электратранспарт. Яны ішлі да гэтага 10 гадоў».

10 гадоў таму ў Нарвегіі доля электратранспарту складала 1 працэнт, прыкладна такая яна і ў Беларусі цяпер, але ў нас стартавыя ўмовы лепшыя, лічыць кіраўнік НАН, бо маюцца ўласныя навуковыя распрацоўкі, мы ўжо выпускаем канкурэнтны электробус.

«Мы гатовыя ўжо зараз, калі будуць інвестыцыі, стварыць на базе сваіх распрацовак электрамабіль — цалкам гатовы, — заявіў Уладзімір Гусакоў. — Толькі шукаем фінансаванне».

Па яго словах, праграма прадугледжвае і вырашэнне пытання стварэння ўласнай батарэі для электрамабіля.

«Распрацоўваецца некалькі відаў батарэй: літый-іонныя (традыцыйныя), графена-свінцовыя і графенавыя, — праінфармаваў акадэмік. — Мы распрацоўваем уласныя, бо літый-іонныя — вельмі дарагія. Цяпер батарэя складае больш за палову кошту аўтамабіля. Акрамя таго, літый будзе даражэць, бо яго запасы абмежаваныя, і яны ў асноўным сканцэнтраваныя ў Кітаі».

Ён паведаміў што ўжо ў студзені беларускія вучоныя правядуць выпрабаванні ўласнай батарэі.

Уладзімір Гусакоў лічыць, што паказчыкі, якія ўтрымлівае праект праграмы, будуць карэктавацца ў бок павышэння, а яе рэалізацыя акажацца больш дынамічнай, чым заклалі распрацоўшчыкі.

Згодна з дакументам, да 2025 года доля грамадскага электратранспарту ў Беларусі складзе 30 % ад агульнай колькасці ўсіх відаў грамадскага транспарту.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Пандэмія можа на 3-5 гадоў стаць пагрозай сусветнай эканоміцы

Аб гэтым перасцерагаюць эксперты Сусветнага эканамічнага форуму (СЭФ), паведаміла Deutsche Welle. У апублікаваным дакладзе СЭФ аб глабальных рызыках Global Risks Report 2021 адзначаецца, што ў выніку пандэміі можа ўзмацніцца сацыяльная няроўнасць і на наступныя 5-10 гадоў аслабне геапалітычная стабільнасць. У прыватнасці, прадстаўнікі бізнесу і розных сацыяльных груп, апытаныя экспертамі, чакаюць, што на працягу наступных 3-5 гадоў пандэмія прывядзе да такіх праблем, як спекулятыўныя бурбалкі, змяненне цэн, пазыковы крызіс і абвальванне ІТ-інфраструктуры.

У Вялікабрытаніі забаставалі крабаловы

У Лондане прайшла акцыя пратэсту крабаловаў: яны прывялі вялікагрузныя машыны з лозунгамі супраць «брэксіту» ў цэнтр горада і прыпаркаваліся каля рэзідэнцыі прэм'ер-міністра. Пратэстоўцы настроены рашуча і заяўляюць, што перамены, якія адбыліся пасля выхаду з ЕС пагражаюць знішчыць галіну. Многія рыбакі былі ў шэрагах самых гарачых прыхільнікаў «брэксіту»: яны спадзяваліся расстацца з сістэмай еўрапейскіх квот на вылаў і вярнуць сабе кантроль над брытанскімі водамі. Аднак, згодна з заключанымі дамоўленасцямі, квоты зменяцца, але не знікнуць па меншай меры на працягу пяці гадоў. Сітуацыю ўскладняе тое, што пасля «брэксіту» ўскладніўся доступ на еўрапейскі рынак.



Моц друкаванага слова

...ДЛЯ САПРАЎДНЫХ ЧЫТАЧОЎ

XXVIII Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш пройдзе пад такой назвай з 18 да 21 лютага ў Нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭкспа». Чакаецца, што ў ёй прыме ўдзел больш за 20 краін. Пра яе праграму, удзельнікаў, асноўныя мерапрыемствы расказаў намеснік міністра інфармацыі Ігар БУЗОЎСКІ.

— На гэтай выстаўцы прапануюцца новыя ідэі, меркаванні не толькі ад яе арганізатараў, але і ад усіх удзельнікаў, якія будуць прэзентаваць свае літаратурныя праекты мінулага года і плануемыя да выпуску выданні на бягучы год. Аматар кніг і чытання чакаюць новыя імёны і фарматы. Наша краіна сёлета адзначае шматлікія юбілейныя даты беларускіх літаратараў, што з'яўляецца нагодай для прэзентацыі вялікай колькасці кніжных праектаў ад беларускіх выдавецтваў. Эпідэмічная сітуацыя ўнесла карэктывы ў правядзенне мерапрыемства, сёлета некаторыя прадстаўнікі замежжа не змогуць прысутнічаць у нас, аднак мы ўкаранілі новыя фарматы работы, у прыватнасці многае будзе праводзіцца анлайн.

Сёлета — 30-годдзе стварэння Садружнасці Незалежных Дзяржаў, гэта паслужыла падставай для вызначэння цэнтральнага экспанента выстаўкі — СНД. Пляцоўка будзе сімвалічна аформлена ў стылі агульнага дома, які складаецца з асобных пакояў.

— У гасцёўні, напрыклад, наведвальнікі азнаёмяцца з найбольш яркімі кніжнымі праектамі, экспазіцыямі кніг, а таксама ўладальнікамі Гран-пры міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі». Дзіцячая кніга нязменна з'яўляецца самай запатрабаванай на выстаўках. Таму ў адпаведным пакоі будзе дадзена магчымасць не толькі ўбачыць навінкі, даведацца аб іх стварэнні, але і цікава правесці час бацькам з дзецьмі. У кабінеце пісьменнікаў будуць прадстаўлены найлепшыя кнігі ўсіх 11 краін СНД па гісторыі, культуры, мастацтве, пройдуць сустрэчы з аўтарамі. Нацыянальны стэнд Беларусі будзе прадстаўлены імправізаванай творчай кухняй, — гэта самая «кніжная» частка цэнтральнай пляцоўкі выстаўкі. Тут будзе выстаўлена максімальная колькасць кніг, выдадзеных за мінулы год у краіне, — адзначыў Ігар Бузоўскі.

Упершыню адбудзецца адбор работ, якія перамаглі ў літаратурным стартапе LitUP, для выдання іх сёлета дзяржаўнымі выдавецтвамі. Такая ініцыятыва прапануецца для тых, хто лічыць сябе сучасным літаратарам, хто хоча выдаць кнігу, якая зацікавіць грамадства, жадае паказаць свае літаратурныя магчымасці. Найлепшыя стартап-праекты будуць адзначаны на фінале 20 лютага. Традыцыйна арганізатары выстаўкі забяспечаць работу бясплатнага паэтычнага аўтобуса, які будзе рухацца ад станцыі метро «Няміга» да выставачнага цэнтра. Гэта дазволіць усім ахвотным даехаць да месца правядзення выстаўкі і пачуць ужывую творы аўтараў падчас паездкі.

— На цэнтральнай сцэне па традыцыі пройдуць прэзентацыі найбольш значных кніжных праектаў, узнагароджанне пераможцаў нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі», міжнароднага конкурсу маладых літаратараў «Першацвет». Таксама адным з галоўных мерапрыемстваў стане Міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час», які запросіць на сваю дыскусійную пляцоўку творчых людзей — прадстаўнікоў пісьменніцкіх колаў з розных краін для сустрэч, выступленняў. Будзе весціся і анлайн-трансляцыя па YouTube-канале, можна будзе адрасаваць свае пытанні непасрэдна яго ўдзельнікам.

Мерапрыемствы выстаўкі-кірмашу пройдуць не толькі на пляцоўках выставачнага комплексу, але і ў кнігарнях, бібліятэках, музеях. У іх адбудуцца прэзентацыі, аўтограф-сесіі, сустрэчы з аўтарамі, майстар-класы і іншае. У тэатрах і кінатэатрах, на тэлеканалах у дні работы выстаўкі пройдуць паказы фільмаў, спектакляў паводле твораў вядомых пісьменнікаў Беларусі і іншых краін.

У першыя дні, з 18 да 20 лютага, Мінская міжнародная выстаўка-кірмаш будзе працаваць з 10 да 20 гадзін, 21 лютага — з 10 да 18 гадзін. Адкрыццё запланавана на 18 лютага а 12-й гадзіне, закрыццё — 21 лютага а 17-й гадзіне. Уваход бясплатны. Арганізатарамі выстаўкі выступаюць Міністэрства інфармацыі, Мінгарвыканкам, ААТ «Белкніга», ТАА «Макбел».

Дар'я ШЛАПАКОВА.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

На слыху

«Прэцэдэнт, пры якім спартыўныя спаборніцтвы могуць ператварацца ў інструмент разладу і ціску»

Арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і правядзенні ў 2021 годзе ў Мінску чэмпіянату свету па хакеі з шайбай, які ўзначальвае прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка, шкадуе аб прынятым беспадстаўным рашэнні IIHF пра перанос з Беларусі гэтага турніру. Адпаведнае паведамленне размешчана на сайце ўрада.

«Такім рашэннем ствараецца прэцэдэнт, пры якім спартыўныя спаборніцтвы, закліканыя аб'ядноўваць краіны і народы, спрыяць усталяванню міру і згоды ў духу алімпійскіх прынцыпаў, могуць ператварацца ў інструмент разладу і ціску, каб дагадзіць інтарэсам палітыканаў», — адзначаецца ў заяве.

Аргкамітэт з беларускага боку адзначае, што з моманту выбару ў якасці арганізатара чэмпіянату Беларусь выконвала ўсе кантрактныя абавязацельствы і ўжо правяла значную работу па арганізацыі турніру ў нашай краіне.

«Разам з тым мы па-ранейшаму верым у вяршэнства аб'яднальнай сілы спорту і ў тое, што міжнародная спартыўная супольнасць зможа выйсці з-пад уплыву палітычных і фінансавых сіл, а хакейная сям'я стане яшчэ больш моцнай і не будзе азірацца на палітычныя амбіцыі людзей, якія не маюць нічога агульнага са спортам», — гаворыцца ў паведамленні беларускага ўрада.

Марыя ДАДАЛКА.

«СТАЛІ АХВЯРАМІ ПАЛІТЫЧНЫХ ГУЛЬНЯЎ ВАКОЛ БЕЛАРУСІ»

Рашэнне прыняў Савет Міжнароднай федэрацыі хакея

У афіцыйнай заяве Міжнароднай федэрацыі хакея (IIHF) сказана, што Савет IIHF правёў добрасумленны і непрадузяты комплексны аналіз. Падчас яго былі праведзены кансультацыі з незалежнымі экспертамі і зацікаўленымі бакамі адносна магчымасці правядзення чэмпіянату свету па хакеі ў Беларусі, нягледзячы на ўзрастаючыя пытанні бяспекі як у сувязі з палітычнымі хваляваннямі, так і з пандэміяй COVID-19. Заключным этапам комплекснай экспертызы IIHF была сустрэча з кіраўніцтвам Беларусі і падрыхтоўка незалежнага даклада экспертаў.

«Вельмі шкада, што прыходзіцца ўносіць змены ў заяўку Мінска і Рыгі па сумесным правядзенні чэмпіянату. Падчас гэтага працэсу мы стараліся прасоўваць ідэю, каб чэмпіянат свету стаў сродкам прымірэння, што дапамагло б супакоіць сацыяльна-палітычную сітуацыю ў Беларусі і знайсці пазітыўны спосаб рухацца наперад», — адзначыў **прэзідэнт IIHF Рэнэ ФАЗЕЛЬ.**

Улічваючы, што Мінск і Рыга падавалі заяўку на сумеснае правядзенне чэмпіянату, Савету IIHF неабходна разгледзець статус Латвіі як суарганізатара, а таксама ацаніць магчымасць пераносу чэмпіянату на адну арэну, каб спрасціць выкананне мер па прадухіленні распаўсюджання COVID-19, а таксама дапамагчы камандам з пераездам. Канчатковае рашэнне аб новым месцы правядзення чэмпіянату свету па хакеі 2021 будзе прынятае пазней.

«Нам шкада, што Міжнародная федэрацыя хакея і найбуйнейшыя сусветныя брэнды, якія падтрымліваюць развіццё сусветнага хакея, сталі ахвярамі палітычных гульняў вакол Беларусі. Нашай краінай была выканана вялікая работа, спачатку па падрыхтоўцы заяўкі на правядзенне чэмпіянату свету, а пасля — непасрэдна па арганізацыі турніру. Са свайго боку, мы па-ранейшаму лічым, што і чэмпіянат свету ў 2021 годзе не стаў бы выключэннем, а як мінімум паўтарыў бы поспех турніру, які мы ўжо прымалі ў 2014 годзе», — пракаментаваў рашэнне Міжнароднай федэрацыі **старшыня Беларускай федэрацыі хакея Дзмітрый БАСКАЎ.**

Працэдура, вызначаная Міжнароднай федэрацыяй хакея, не прадугледжвае магчымасці апеляцыі.

Валерыя СЦЯЦКО.

Актуальна

АДКАЗ ЗА КОЖНЫ СКАЗ

Мінінфарм разглядае шэраг матэрыялаў інтэрнэт-рэсурсу tut.by для дачы прававой ацэнкі.

Аб гэтым заявіў журналістам **міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар ЛУЦКІ** пасля завяршэння прэс-прэзентацыі асноўных палажэнняў праекта Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны да 2025 года.

— Пакуль адбывалася мерапрыемства, мы атрымалі інфармацыю аб тым, што прынята рашэнне аб перапыненні выпуску сеткавага выдання tut.by, — рассказаў ён журналістам і адзначыў, што на працягу 2020 года міністэрствам было вынесена чатыры папярэджанні гэтаму сеткаваму выданню.

Міністр інфармацыі растлумачыў, што ў адпаведнасці з законам аб СМІ рэгулятар прад'явіў позву ў суд аб перапыненні дзейнасці сеткавага выдання tut.by.

— Неабходна адзначыць, што Вярхоўным судом была пацверджана законнасць і абгрунтаванасць вынесеных папярэджанняў, — падкрэсліў Ігар Луцкі. — 3 снежня 2020 года Эканамічным судом горада Мінска было прынята рашэнне аб перапыненні дзейнасці, а сёння апеляцыйная інстанцыя пацвердзіла гэтае рашэнне. Таму ўсе дзеянні Мінінфарма, якія доўжыліся ўвесь гэты час (праходжанне праз усе судовыя інстанцыі) завяршыліся рашэннем, якое абсалютна задавальняе Міністэрства інфармацыі.

Ён паведаміў, што на гэты момант Мінінфармам разглядаецца шэраг матэрыялаў, якія размяшчаюцца ўжо на інтэрнэт-рэсурсе tut.by для таго, каб даць прававую ацэнку ў частцы парушэння Закона «Аб сродках масавай інфармацыі» і размяшчэнне недакладнай інфармацыі, якая можа нанесці шкоду грамадскаму і дзяржаўнаму інтарэсам.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Трэба ведаць

Холадна? Паведамляйце!

ФПБ праводзіць узмоцнены маніторынг умоў працы ў марознае надвор'е

Што рабіць, калі тэмпература ніжэй за норму, няпоўнае абсталяванне бытавых памяшканняў і недахоп цёплага рабочага адзення?

Менавіта такія парушэнні былі зафіксаваны прафсаюзамі пры маніторынгу тэмпературнага рэжыму на прадпрыемствах падчас моцных маразоў, паведамілі ў прэс-службе ФПБ.

— З 13 студзеня, калі ўсталявалася досыць халоднае надвор'е, мы праводзім узмоцнены маніторынг умоў працы, — адзначыў **Павел МАНЬКО, галоўны тэхнічны інспектар працы Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.** — Трэба адзначыць, што ў большасці арганізацый сур'ёзна паставіліся да гэтага пытання. Разам з тым ёсць і выпадкі, дзе недастаткова падрыхтаваліся да работы ва ўмовах моцных маразоў: у першую чаргу гэта няпоўнае ўкамплектаванне бытавых памяшканняў, забеспячэнне работнікаў цёплым адзеннем і абуткам, невыкананне патрабаванняў па ўвядзенні дадатковых перапынкаў для абагрэву работнікаў.

Таксама зафіксаваныя выпадкі, калі тэмпература на рабочых месцах у памяшканнях, якія ацяпляюцца, была значна ніжэйшай за норму.

Нагадаем, што, згодна з заканадаўствам, тэмпература ў офісах павінна быць +20 °С і вышэй. У вытворчых памяшканнях у залежнасці ад інтэнсіўнасці і віду работ — ад +6 да 19 °С.

Што датычыцца работ на адкрытым паветры ці ў халодных памяшканнях, то ў заканадаўстве таксама прапісаны ўмовы па арганізацыі працоўнага працэсу пры тэмпературы -25 °С і ніжэй.

Так, у людзей, якія працуюць на адкрытым паветры ці ў памяшканні, якое не ацяпляецца, акрамя абеду, павінны быць перапынкі, каб пагрэцца. Наймальнік абавязаны абсталяваць памяшканні для абагрэву і рэгламентаваць працягласць такіх перапынкаў. Звычайна гэта 15-20 хвілін праз кожныя дзве гадзіны. Пры гэтым такія перапынкі ўваходзяць у рабочы час. Умовы іх абвяшчэння павінны быць дакладна прапісаны ў правілах унутранага працоўнага распарадку ці ў калектыўным дагаворы.

Прафсаюзны маніторынг захавання тэмпературнага рэжыму будзе праводзіцца на працягу ўсяго зімовага перыяду. Пры гэтым для аператыўнага рэагавання на парушэнні ў Федэрацыі прафсаюзаў працуе гарачая лінія.

Аб сітуацыях, калі на рабочым месцы холадна, не выдадзены сезонныя спецадзенне і абутак, не абсталяваны памяшканні для адпачынку, не ўстаноўлены перапынкі для абагрэву, можна паведаміць па тэлефоне **+375 17 203 90 48** (гарачая лінія працуе па будных днях з **8.30** да **10.30** і з **15.00** да **17.30**).

«Варта ісці не насустрач адно аднаму, а разам у адным кірунку»

Ірына ДАЎГАЛА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве, дэлегат Усебеларускага народнага сходу.

house.gov.by

Працуючы ў органах дзяржаўнай улады, яна была пэўным чынам датычная да падрыхтоўкі Усебеларускіх народных сходаў, а сёлета ўжо ў другі раз займела і статус дэлегата. Ірына Віктараўна падзялілася сваімі чаканнямі ад мерапрыемства і растлумачыла, чаму мяркуе, што беларусам лепш ісці не насустрач адно аднаму....

— Формы народаўладдзя ў выглядзе з'ездаў, сходаў уяўляюць сабой удзел у абмеркаванні пытанняў прадстаўнікоў усіх рэгіёнаў краіны, працаўнікоў разнастайных галін, членаў шырокага кола партый і грамадскіх аб'яднанняў. І ў бягучым годзе на Усебеларускім народным сходзе будуць прадстаўлены інтарэсы і праблемы ўсіх слаёў насельніцтва. Сход, як бы яго ні крытыкавалі, — форма, якая сябе ўжо зарэкамендавала. На Усебеларускім народным сходзе збіраюцца людзі, каб вырашаць сацыяльныя, эканамічныя і іншыя праблемы, якія важныя сёння для ўсёй дзяржавы і для кожнага асобна ўзятага чалавека.

Я доўгі час працавала ў дзяржаўных органах і нават ускосна мела дачыненне да падрыхтоўкі самага першага Усебеларускага сходу ў 1996 годзе. Адзначу, што кожны сход меў свае асаблівасці. Так, у 2010 годзе ў ім бралі ўдзел 13 Герояў Савецкага Саюза і Герояў Сацыялістычнай працы. У маёй Гомельскай вобласці, якую я прадстаўляю ў парламенце, на жаль, больш Герояў Савецкага Саюза не засталося. Тэматыку форумаў падкрэсліваюць і яго лозунгі, якія кожны раз новыя. Але на ўсіх сходах у абавязковым парадку прымалася Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на пяць гадоў.

Цікава, што на самым першым Усебеларускім народным сходзе была ініцыятыва па змяненнях у Канстытуцыю. І сёння чаканні дэлегатаў ад гэтага форуму звязаныя з абмеркаваннем новаўвядзенняў у Асноўны Закон краіны. Канстытуцыя — гэта платформа, ад якой будуць ісці астатнія заканадаўчыя акты, кодэксы, нарматыўна-прававыя акты. На гэтым зводзе нормаў наогул будзе будавацца жыццё беларускага народа.

Дарэчы, дадам вось яшчэ што. Ідуць звароты і прапануюцца думкі, каб у краіне пакінулі адну дзяржаўную мову. Дык вось, двухмоўе было прапанавана замацаваць менавіта на сходзе ў 1996 годзе. Сёння праблем з гэтым у нас няма, і дзве мовы нармальна суіснуюць. І беларускай, і рускай мовам месца ў нашай краіне ёсць.

Вельмі цікавая і неабходная форма гутаркі, на якую я хачу звярнуць увагу іншых дэлегатаў, — дыялогавыя пляцоўкі. Іх неабходна пакінуць у нашым асяроддзі, яны патрэбны як паветра. Нам важна знайсці кампраміс, які дазволіць пачуць кожнага і працаваць на стварэнне, а не на разбурэнне.

Яшчэ адзін вельмі значны момант — тое, што сёлета аб'яўлены Год народнага адзінства. На маю думку, з гэтага вынікае некалькі важных складнікаў. Па-першае, год пачынаецца з найважнейшай падзеі — Усебеларускага народнага сходу. Па-другое, у 2021-м будзем успамінаць 80-годдзе з пачатку Вялікай Айчыннай вайны — вялікага гора, якое напаткала наш народ і якое аб'яднала ў цяжкі час. Таму тэма народнага адзінства вельмі трапная. Трэба спыніцца, як той казаў, выдыхнуць і пайсці не насустрач адно аднаму, а ў адным кірунку. Калі мы будзем ісці насустрач адно аднаму, мы сустрэнемся, але потым кожны зноў пойдзе ў свой бок. Таму я кажу: варта ісці не насустрач адно аднаму, а разам у адным кірунку.

Марыя ДАДАЛКА.

«Відавочна, трэба шукаць новыя пункты росту, каб рухацца далей»

Юлія РАГАШЧУК, намеснік загадчыка арганізацыйна-кадравай работы Брэсцкай абласной арганізацыі ГА «БРСМ», член Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь:

— Сёння арганізацыя дыскусійных пляцовак, з майго пункту гледжання, дазволіла згуртаваць народ нашай краіны. Разглядаюцца розныя пытанні, якія датычацца ўсіх сфер жыццядзейнасці грамадства. Немалаважны той факт, што гэтыя дыскусіі закранаюць будучыню Беларусі. Бо розныя па сваёй прафесійнай дзейнасці, меркаваннях і поглядах людзі аб'ядноўваюцца для прыняцця адзінага рашэння наконт развіцця дзяржавы ў найбліжэйшую пяцігодку.

Мне цікава далейшае развіццё дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, якія будуць змяненні і дапаўненні. Відавочна, што ўжо нямала робіцца ў гэтым кірунку, але трэба шукаць нейкія новыя пункты росту, каб рухацца далей.

На VI Усебеларускім народным сходзе я буду ўпершыню. Гатовая быць актыўным удзельнікам дыялогу, прапаноўваць канструктыўныя ідэі на карысць нашага грамадства.

Вольга АНУФРЫЕВА.

«Будучыня нашай вёскі — за аграгарадкамі»

Лілія СЛУЦКАЯ, сацыяльны работнік тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дэпутат Маркаўскага сельскага Савета Маладзечанскага раёна:

Фота Аляксея ПЛОТКІ.

— Усебеларускі народны сход, як і кожная знакавая падзея нацыянальнага маштабу, гэта, акрамя іншага, яшчэ і нагода кінуць позірк у недалёкае мінулае, зрабіць пэўныя параўнанні і высновы. Я пастаянна ў кантакце з людзьмі, бачу, як яны жывуць сёння, нярэдка параўноўваю з тым жыццём, якое было ў іх адносна нядаўна. І мае параўнанні на карысць сённяшняга дня.

Наш аграгарадок Маркава — невялікі населены пункт, у ім каля сямісот жыхароў. Тут дзве сельгасарганізацыі, у якіх працуе асноўная колькасць маіх аднавяскоўцаў, ёсць сярэдняя школа, дзіцячы садок, урачэбная амбулаторыя, дзве крамы, пошта, больш-менш прыстойныя дарогі. Напрыклад, летась заасфальтавалі калі пяці кіламетраў дарогі паміж вёскамі Клочкава і Ленкаўшчына. Іх жыхары цяпер вельмі задаволеныя. Карацей, ёсць усё для нармальнага жыцця, спалучэння выгод навакольнага прыроднага асяроддзя і гарадскіх умоў.

Важная прыкмета часу: за апошнія тры-чатыры гады да нас патроху сталі пераязджаць гараджане, адносна нядаўна пераехала з аддаленага населенага пункта шмадзетная сям'я. У нас выдзяляюцца зямельныя ўчасткі пад будаўніцтва жылля, да якога ёсць магчымаць падключыць прыродны газ. Гэта прываблівае маладых забудоўшчыкаў. І я ўсё больш пераконваюся ў думцы, што будучыня беларускай вёскі за аграгарадкамі.

Не адкрыю Амерыку, калі скажу, што зямля — наша агульнанацыянальнае багацце, якім трэба даражыць і пра які неабходна ўсяляк клапаціцца. Зямля па-ранейшаму корміць вяскоўцаў. Я маю на ўвазе не толькі ўраджаі, прыбаўленні ў вазе і надоі сельскіх гаспадарак, але і здабыткі прыватнага сектара вясковых падворкаў. Іх унёсак у харчовую бяспеку краіны ўнушальны. У Беларусі зараз налічваецца больш за 900 тысяч асабістых падсобных гаспадарак, у якіх вырабляюцца сотні тысяч тон бульбы, агародніны, збожжавых і зернебабовых, свініны, мяса птушкі і іншай сельскагаспадарчай прадукцыі на мільярды рублёў.

Можна падлічыць, колькі калгасаў, кажучы па-савецку, замяняюць вясковыя гаспадары, якіх, на маю думку, мясцовым уладам трэба стымуляваць, павышаць матывацыю вядзення асабістай дапаможнай гаспадаркі. І на дзяржаўным узроўні абавязкова падтрымліваць вясковыя падворкі, заахвочваць іх гаспадароў трымаць кароў, гадаваць бычкоў, птушак. Няхай адзін жывёлагадоўчы комплекс замяняе сотні хлеўчукоў, тым не менш скажу з уласнага досведу шчыра: ежа з вясковых падворкаў больш смачная і прывабная. Мая сям'я мае невялікі агарод. Ён усяго тры сотачкі, але нам хапае для самазабеспячэння агароднінай, садавіной, ягадамі. Садзім бульбу на іншым участку. Раней трымалі карову.

Нашы дэпутаты Маркаўскага сельскага Савета імкнуцца рабіць усё магчымае для падтрымкі прысядзібных падворкаў: выдзяляюць зямлю, дапамагаюць з кармамі, тэхнікай для ўборкі, заахвочваюць гаспадароў трымаць кароў, гадаваць бычкоў і іншую жывёлу. Бо гэта ў першую чаргу сродак самазабеспячэння сям'і якасным экалагічна чыстым харчаваннем, дадатковая крыніца даходаў жыхароў сельсавета.

Сёння мае думкі, прапановы да сходу — пра будучы дзень беларускай вёскі. У Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2021—2025 гг. лічу неабходным вызначыць комплекс мер, якія будуць накіраваныя на павышэнне эфектыўнасці выкарыстання зямлі. Трэба супрацьстаяць тэндэнцыі зніжэння долі вясковых гаспадарак у агульным аб'ёме вытворчасці сельсгапрадукцыі. Дапамога сельскай гаспадарцы краіны, у тым ліку і асабістым дапаможным гаспадаркам, павінна быць у дзяржаўным прыярытэце.

Надышоў час канчаткова навесці парадак на зямлі. Не сакрэт, што вялікая колькасць зваротаў грамадзян і суб'ектаў гаспадарання з рэгіёнаў у органы мясцовай улады, у вышэйстаячыя інстанцыі — пра зямлю. Нездарма нашы парламентарыі, у прыватнасці члены Савета Рэспублікі, кажуць, што ў грамадстве даўно наспела пытанне сутнаснага ўдасканалення заканадаўства аб ахове і выкарыстанні зямель, сістэмнай рэвізіі і канцэптуальнага перагляду гэтых праваадносін, у тым ліку перагляду неактуальных і непрымяняльных на практыцы нарматыўных прадпісанняў.

Леанід ТУГАРЫН.

АБРЫСЫ ГАЛОЎНЫХ ЗАДАЧ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Таму праект Праграмы — гэта вынік сумеснай працы, у першую чаргу навукоўцаў, бізнесу, грамадскіх арганізацый і экспертаў органаў дзяржкіравання, — падкрэсліў міністр.

Ён адзначыў, што пры яе распрацоўцы ўлічваліся і праблемы, якія засталіся нявырашаныя ў папярэдняй пяцігодцы, і таксама сітуацыя ў свеце, якая рэзка змяняе канфігурацыю ўмоў развіцця. Гаворка, у прыватнасці, пра больш жорсткую канкурэнцыю, пратэкцыянізм, рэгіяналізацыю і абмежаванне ў допуску да новых тэхналогій і выхад на фінансавыя рынкі. Сярод унутраных абмежаванняў Аляксандр Чарвякоў назваў зніжэнне дэмаграфічнага патэнцыялу, адставанне па прадукцыйнасці працы ад еўрапейскіх дзяржаў і высокую залежнасць эканомікі ад вуглевадароднай сыравіны.

— Таму праграма развіцця павінна не толькі рэагаваць і ніверліраваць выклікі і абмежаванні, але і ствараць аснову для будучага росту, — перакананы ён.

САЦЫЯЛЬНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ ЗАХАВАЕЦЦА

Вызначаючы абрысы развіцця эканомікі, міністр агучыў тры яе асноўныя рысы. Перш-наперш дзяржава працягне захоўваць сацыяльную накіраванасць, дзе галоўная мэта — рост дабрабыту людзей.

— Асноўная ўвага будзе аддадзена даходам насельніцтва, цэнам, занятасці, даступнасці жылля, а таксама высокатэхналагічным паслугам у сферах аховы здароўя і адукацыі, — падкрэсліў міністр.

Другая рыса эканомікі датычыцца далейшага развіцця індустрыяльнага патэнцыялу ў традыцыйных галінах прамысловасці і сельскай гаспадаркі, але толькі на новай тэхналагічнай базе і лічбавай аснове.

І нарэшце, трэцяя асаблівасць — неабходнасць фарміравання новых высокатэхналагічных галін і прадпрыемстваў.

У якасці прыярытэтаў распрацоўшчыкі праекта Праграмы вылучаюць чатыры асноўныя кірункі. Першы, відавочна, адзін з найважнейшых — шчаслівая сям'я. Па задуме аўтараў праграмы яго рэалізацыя прадугледжвае ўмацаванне традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, у аснове якіх здаровая сям'я, падтрымка маладых і клопат аб старэйшым пакаленні.

Другі прыярытэт — моцныя рэгіёны. І тут акцэнт робіцца на камфортныя і бяспечныя ўмовы жыцця і працы ў любым кутку краіны.

Трэці — інтэлектуальная краіна. У аснове гэтага прыярытэту пакладзены адукацыя і навучанне, развіццё навукі, падтрымка вынаходніцтва і рацыяналізатарства, раскрыццё творчага патэнцыялу.

Чацвёрты прыярытэт — дзяржава-партнёр. Маецца на ўвазе ўмацаванне дыялогу і ўзаемнага даверу паміж дзяржавай і чалавекам, дзяржавай і бізнесам, дзяржавай і грамадствам.

— І калі першыя тры прыярытэты адказваюць за развіццё чалавечага патэнцыялу (якасць рабочай сілы, яе высокага інтэлекту і стварэнне камфортных і бяспечных умоў у рэгіёнах), то чацвёрты прыярытэт дазваляе атрымаць сінергетычны эфект ад шчыльнага ўзаемадзеяння паміж дзяржавай, грамадствам, чалавекам і бізнесам. А сукупнасць прыярытэтаў дазваляе забяспечыць сацыяльную стабільнасць у грамадстве і дабрабыт нашых грамадзян, — перакананы Аляксандр Чарвякоў.

Адсюль лагічна вынікае канструкцыя Праграмы, якая складаецца таксама з чатырох ключавых блокаў: паляпшэнне якасці жыцця насельніцтва, умацаванне эканамічнага патэнцыялу і лічбавая трансфармацыя, рэгіянальнае развіццё і стварэнне спрыяльнага рэгуляторнага асяроддзя.

Фота БелТА.

АД РЭГІЯНАЛЬНЫХ МЕДЦЭНТРАЎ ДА ЗМЕНЫ ФАРМАТУ ЎСТУПНЫХ КАМПАНІЙ

Пачнём з першага — паляпшэнне якасці жыцця насельніцтва, якое вызначаецца ўзроўнем медыцыны, адукацыі, сацыяльнай абароны і даходамі насельніцтва.

Безумоўна, у ахове здароўя даступная і якасная медыцына — аснова высокага ўзроўню, якога дасягнула грамадства. У развіцці медыцыны на пяцігодку распрацоўшчыкі бачаць тры асноўныя кірункі.

Першы — зніжэнне ўзроўню захваральнасці насельніцтва і эпідэміялагічная бяспека. Асноўнымі мерамі ў гэтым стануць прафілактычныя скрынінгі і дыспансерызацыя. Будуць узмоцнены меры па прадухіленні распаўсюджання хвароб і інфекцый, мінімізацыі наступстваў каранавіруса.

Другі кірунак датычыцца фарміравання высокатэхналагічнай медыцыны ў рэгіёнах. Плануецца стварыць сетку з 12 міжрэгіянальных цэнтраў аказання спецыялізаванай медыцынскай дапамогі. Цэнтры будуць аснашчаны неабходным сучасным дыягнастычным абсталяваннем.

Трэці кірунак — лічбавізацыя медыцыны, якая будзе пабудавана на ўкараненні адзінай тэлекамунікацыйнай інфраструктуры аховы здароўя на базе 5G. Што гэта прынясе? Інтэлектуальныя сістэмы дадуць магчымасць дыстанцыйнага маніторынгу здароўя, а тэлемедыцына і рабатызацыя — правядзення высокатэхналагічных аперацый.

Між іншым, акрамя медыцыны ў сацыяльным блоку акцэнт робіцца і на развіццё адукацыі. Задача, якую абазначылі распрацоўшчыкі, — забяспечыць такі ўзровень адукацыі, пры якім чалавек змог бы лёгка і свабодна ставіць перад сабой мэты і задачы і дасягаць іх з актуальным наборам ведаў і ўменняў, заставаючыся запатрабаваным на працягу ўсяго жыццёвага цыклу.

Так, у сістэме сярэдняй адукацыі акцэнт будзе рабіцца на ранняй прафесійнай адукацыі і самавызначэнні, фарміраванні ў школьнікаў інавацыйных і прадпрымальніцкіх навыкаў. Для гэтага прапануецца павялічыць вучэбныя гадзіны па дакладных навуках: фізіцы, хіміі, матэматыцы. У сістэме вышэйшай адукацыі прадугледжваюцца змены фармату ўступных кампаній, а таксама павышэнне практыкаарыентаванасці адукацыйнага працэсу. Для старэйшага пакалення (55+) будуць укараняцца праграмы дадатковай адукацыі, у тым ліку навучанне інфармацыйным тэхналогіям.

З'ЯВІЦЦА НОВАЯ СТРУКТУРА — ДЗЯРЖКАРПАРАЦЫЯ

Другі блок праграмы датычыцца ўмацавання эканамічнага патэнцыялу і лічбавай трансфармацыі. У вырашэнні гэтага пытання росту эканомікі асноўнымі вектарамі развіцця павінны стаць павелічэнне ўнутранага спажывання, разгортванне новага інвестыцыйнага цыкла і рэалізацыя экспартнай стратэгіі. Што датычыцца першага, гаворка аб стымуляванні куплі айчынных тавараў, другога — росту прадукцыйнасці працы, павелічэнні канкурэнтаздольнасці і экспартных магчымасцяў, стварэнні развітой інфраструктуры ва ўсіх рэгіёнах краіны.

— Больш жорсткая канкурэнцыя на рынках свету патрабуе новых арганізацыйных бізнес-мадэляў прадпрыемстваў, — перакананы міністр эканомікі. — Прадугледжваецца стварэнне новай арганізацыйнай структуры — дзяржаўнай карпарацыі — на аснове аб'яднання па прынцыпе вытворчых ланцужкоў: ад вытворцы сыравіны да канчатковага прадукту.

Як растлумачыў Аляксандр Чарвякоў, на першапачатковым этапе прапрацоўваецца стварэнне сямі дзяржкарпарацый у прамысловай галіне. Што гэта дасць?

Па-першае, магчымасць аб'яднаць рэсурсы і скараціць выдаткі. Па-новаму вырашыць пытанні з фінансавым аздараўленнем некаторых арганізацый.

Па-другое, павысіць аддачу ад дзяржактываў, перш за ўсё за кошт удасканалення сістэмы кіравання імі. Канчатковая мэта — выбудаваць такую рацыянальную схему ўзаемадзеяння паміж прадпрыемствамі, каб стварыць і прадаваць не проста тавар, а прадуктовы комплекс тавараў і паслуг, у тым ліку сэрвіснае і гарантыйнае абслугоўванне.

Паводле слоў міністра, ужо адпрацаваны перспектывы па першай пілотнай дзяржкарпарацыі сельгасмашынабудавання з агульным аб'ёмам выручкі больш за тры мільярды рублёў. Плануецца, што яна стане значным гульцом на усветным рынку сельгастэхнікі.

Яшчэ адна навацыя ў сістэме ўзаемадзеяння — кластарызацыя, якая аб'яднае ў сабе навуку, прыватны бізнес і буйныя дзяржкарпарацыі. Усе яны аб'яднаны агульнай мэтай — стварэннем інавацыйнага прадукту.

У рэгіёнах кластары з'явяцца ў найбольш перспектыўных сферах: біятэхналогій і «зялёнай» эканомікі, хіміі і нафтахіміі, аўтамабілебудавання і гэтак далей. Такім чынам павінна з'явіцца 13 кластараў. Як, напрыклад, ужо адбылося ў нафтахімічнай галіне на базе «Нафтана» і Полацкага ўніверсітэта, дзе створаны кластар, які пачынае актыўна развівацца.

КААПЕРАЦЫЙНЫЯ ЛАНЦУЖКІ І 5G У ВЁСЦЫ

Асноўная мэта — скараціць розніцу ва ўзроўні і якасці жыцця людзей у рэгіёнах. Лакаматывамі павінны стаць абласныя цэнтры і гарады з насельніцтвам 80 тысяч чалавек. Іх развіццё павінна ўцягнуць прылеглыя раёны і сфарміраваць агульны тэрытарыяльна-гаспадарчы комплекс.

— Калі казаць аб прыярытэтах развіцця, то Мінск і абласныя цэнтры сканцэнтруюцца на прыцягненні інвестыцый у высокатэхналагічныя вытворчасці. Для гэтага ў іх ёсць вытворчы і навукова-даследчы патэнцыял, — перакананы міністр.

Да гэтага працэсу плануецца падключыць прыватны бізнес. Яму прапануюць невыкарыстоўваемыя пляцоўкі дзяржпрадпрыемстваў, удзел у праграмах імпартазамяшчэння і кааперацыйных ланцужкоў з буйнымі прамысловымі прадпрыемствамі (МАЗам, БелАЗам, «Гомсельмашам» і іншымі).

У гарадах з насельніцтвам звыш 80 тысяч чалавек з'явяцца індустрыяльныя пляцоўкі, падрыхтаваныя па прынцыпе «апошняй мілі» з інжынернай інфраструктурай.

У малых і сярэдніх гарадах, сельскіх раёнах акцэнт прапануецца зрабіць на паглыбленне перапрацоўкі мясцовых рэсурсаў і сельгаспрадукцыі, стварэнне прадпрыемстваў на гэтай аснове.

Але для прывабнага жыцця паза горадам неабходна наблізіць інфраструктуру да гарадской: бяспечныя дарогі, садкі, школы, здраўніцы, гадзінная дасягальнасць да месца работы, сувязь 5G.

Паводле слоў Аляксандра Чарвякова, усё гэта прадугледжана ў пяцігадовай праграме.

ГРУНТОЎНЫ ДАКУМЕНТ АБМЯРКУЮЦЬ НА МЕСЦАХ

І, нарэшце, апошні чацвёрты блок — фарміраванне спрыяльнага інстытуцыянальнага асяроддзя. Галоўным пунктам тут выступае, па словах міністра, стварэнне прывабнасці беларускай юрысдыкцыі для бізнесу і інвестара.

— Таму на разгляд Усебеларускага народнага сходу выносяцца меры па дадатковых гарантыях абароны правоў добрасумленнага бізнесу і інвестараў, — растлумачыў ён.

Па-першае, прапануецца перагледзець падставы для прыцягнення эканамічных агентаў да крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці за правапарушэнні ў эканамічнай галіне. За эканамічныя правіны толькі эканамічнае пакаранне.

Па-другое, для інвестараў прапануецца ўвесці стабілізацыйную агаворку, сутнасць якой у тым, каб не павялічваць падаткі на тэрмін да 5 гадоў у межах інвестыцыйнай дамовы.

Далей. Увесці прававы рэжым спецыяльнай інвестдамовы, калі дзяржава гарантуе інвестару выкуп часткі прадукцыі, створанай на новых вытворчасцях.

Для інавацыйных праектаў і праектаў на асобных тэрыторыях плануецца пашырыць памер інвестыцыйных вылікаў, якія можна аднесці на затраты.

Акрамя таго, неабходна пашырыць паўнамоцтвы мясцовых органаў кіравання па пытаннях рэгулявання зямельных і маёмасных адносін.

Увесь пералічаны вышэй пласт тэм — гэта толькі абрысы планаваемых змен, якія яшчэ будуць насычацца прапановамі з месцаў падчас абмеркаванняў у рэгіёнах на круглых сталах і дыялогавых пляцоўках з удзелам дэлегатаў УНС. Безумоўна, карэкціроўкі будуць дарэчы, бо грунтоўны дакумент, якім будзе кіравацца краіна ў сваім развіцці на сярэднетэрміновую перспектыву, патрабуе рэгіянальнай актуалізацыі.

Застаецца толькі адно пытанне: на які вынік мы разлічваем?

Як паведаміў Аляксандр Чарвякоў прысутным на прэс-прэзентацыі журналістам, рэалізацыя ўсяго комплексу мер дазволіць за пяцігоддзе забяспечыць ВУП у памеры 121,5 % (больш за 81 мільярд долараў у 2025 годзе), рэальных грашовых даходаў насельніцтва — 120,2 %, інвестыцый у асноўны капітал — 122,4 % (а гэта амаль 210 мільярдаў рублёў за пяць гадоў), экспарту тавараў і паслуг — у 1,4 раза і павялічыць яго да больш чым 50 мільярдаў долараў у 2025 годзе.

— У сваю чаргу, дасягненне зададзеных параметраў дазволіць стварыць неабходныя ўмовы для паляпшэння дабрабыту і якасці жыцця насельніцтва, — рэзюмаваў міністр эканомікі.

Вольга АНУФРЫЕВА.

«АТАМНАЕ» ЖЫЦЦЁ І РАБОТА «Ў СПАДЧЫНУ»

Першы энергаблок Беларускай АЭС выйшаў на намінальны ўзровень сваёй магутнасці — 1170 МВт. На станцыі працягваецца этап вопытна-прамысловай эксплуатацыі, які распачаўся 22 снежня, у Дзень энергетыка. Цяпер на 100-працэнтнай магутнасці працягнуцца статычныя і дынамічныя выпрабаванні і цягам 15 дзён будзе праведзена комплекснае апрабаванне абсталявання і сістэм энергаблока... Як спалучаць работу на стратэгічным аб'екце і быць шматдзетным бацькам, чаго каштуе вучыцца ўсё жыццё і адказваць за маладыя кадры? Пра ўсё гэта карэспандэнту «Звязды» расказаў намеснік начальніка рэактарнага цэха Беларускай АЭС Сяргей ГОРЫН, беларус па нараджэнні, які вырас у Расіі, а 12 гадоў таму вярнуўся на галоўную атамную будоўлю краіны ўжо расіянінам, аднак за гэты час ізноў стаў тутэйшым. Удзячная за размову я мушу быць у тым ліку і яго дачцэ Лізе, якая нагадвае бацьку пра ўсе яго абяцанні: ад паездкі з лекцыяй у школу да даўно запланаванага інтэрв'ю, для якога знайшоўся час, нягледзячы на напружаную работу падчас чарговага этапу на станцыі. У свае восем дзяўчынка разумее работу атамшчыка і будуе планы, куды пайсці вучыцца, каб стаць, «як тата».

Псіхалагічная ўстойлівасць і адказнасць

Рэактарны цэх — элітнае структурнае падраздзяленне атамнай электрастанцыі, у якім здольны працаваць далёка не кожны. А ўвогуле, каб стаць інжынерам-атамшчыкам, трэба па-сапраўднаму любіць сваю прафесію. Так лічаць на АЭС і маюць рацыю. Работа ў атамнай галіне — гэта і высокая адказнасць, і вучоба на працягу ўсяго жыцця, незалежна ад узросту, стажу работы і пасады.

«Энергаблок будзе працаваць не адно дзесяцігоддзе. Каб гады яго работы былі паспяховыя, мы павінны цяпер, на этапе вопытна-прамысловай эксплуатацыі, усё добра праверыць».

Варта адзначыць, што нават дыплом прэстыжнай ВНУ не з'яўляецца гарантыяй работы на пасадзе інжынера па кіраванні рэактарам. Ужо на атамнай станцыі маладому спецыялісту трэба будзе прайсці складанае выпрабаванне: псіхолага-фізіялагічнае абследаванне, у выніку якога вопытныя псіхолагі вызначаць, ці здольны малады інжынер па сваіх псіхалагічных якасцях да работы на адказнай пасадзе. Калі ж у кандыдата будуць выяўлены, напрыклад, няўстойлівасць увагі, схільнасць да рызыкі ці прыняцця паспешлівых рашэнняў ва ўмовах высокай адказнасці, да работы па кіраванні рэактарам яго не дапусцяць, падкрэсліў Сяргей Горын.

— Каго ж бяруць у атамшчыкі?

— Мы шукалі вопытных спецыялістаў, якія маюць профільную тэхнічную адукацыю і вопыт работы з цеплагідраўлікай. Запрашалі іх на работу, затым адпраўлялі на перападрыхтоўку ў Обнінскі інстытут атамнай энергетыкі, на стажыроўку на дзеючыя АЭС. Пасля яны праходзілі доўгі курс тэорыі і практыкі ўжо на беларускай станцыі, у тым ліку на поўнамаштабным трэнажоры пульта кіравання энергаблокам у вучэбна-трэніровачным цэнтры атамнай электрастанцыі. Цяпер многія з іх — вядучыя інжынеры кіравання рэактарам, начальнікі змен.

Зразумела, на першай Беларускай АЭС знайшлі работу і маладыя спецыялісты — выпускнікі беларускіх ВНУ, якія з 2014 года працуюць на станцыі. Многія з іх ужо «дараслі» да вядучых інжынераў па кіраванні рэактарам.

Вопытных спецыялістаў запрашалі таксама з атамных электрастанцый Украіны і Расіі, у маладых супрацоўнікаў ёсць магчымасць пераймаць практычны вопыт, а не толькі асвойваць «атамныя азы» ў тэорыі.

Па сутнасці, малады спецыяліст пасля інстытута — гэта чысты аркуш. Перш чым сесці за блочны пульт кіравання ядзерным рэактарам, дыпламаваны інжынер павінен прайсці не адну прыступку кар'ернай лесвіцы: ад аператара рэактарнага аддзялення да старшага аператара, інжынера па эксплуатацыі рэактарнага абсталявання і, нарэшце, да вядучага інжынера па кіраванні рэактарам.

Такім чынам, ад студэнцкай парты да практычнай работы па кіраванні рэактарам праходзіць не менш за тры гады, падчас якіх малады спецыяліст атрымлівае прафесійны вопыт, праходзіць навучанне, здае экзамены і залікі і на фінішы трымае найадказнейшы экзамен у Дзяржатамнаглядзе на атрыманне ліцэнзіі на права кіравання ядзерным энергетычным рэактарам.

— Як арганізавана работа ў рэактарным цэху?

— Паколькі вялікае месца ў нашай рабоце займаюць навучанне і пастаяннае падтрыманне кваліфікацыі, той, хто марыць працаваць на АЭС і ў рэактарным цэху ў тым ліку, павінен прывыкнуць да думкі, што ўсё яго жыццё пройдзе з кніжкай у руках. Акрамя пастаяннай вучобы, персанал падтрымлівае кваліфікацыю ў межах адпаведнай праграмы, што дзейнічае на станцыі. Работнікі рэактарнага цэха трэніруюцца на поўнамаштабным трэнажоры блочнага пульта кіравання. Для іншых спецыяльнасцяў распрацаваны свае лакальныя трэнажоры.

Работа ў рэактарным цэху арганізавана ў тры змены па восем гадзін. Каб станцыя працавала кругласутачна, патрэбны пяць змен супрацоўнікаў. У кожнай змене — шэсць чалавек. Графік работы — тры рабочыя дні, затым два выхадныя. Паколькі нехта можа захварэць ці пайсці ў адпачынак, на кожнай пасадзе ў змене прадугледжана па сем чалавек. Пяцёра працуюць. Адзін заменіць калегу на час водпуску. Яшчэ адзін у рэзерве. А тых, хто працуе на блочным пульце кіравання, увогуле восем, таму што хтосьці з інжынераў пастаянна знаходзіцца на павышэнні кваліфікацыі. А яшчэ спецыялістаў са змены першага энергаблока нельга проста перамясціць на работу на другім энергаблоку, бо кожны блок мае сваю спецыфіку.

Сімвалізм і «атамная» дынастыя

Стрэсу, як некаторыя думаюць, у рабоце няма, проста прывыкаеш быць заўжды напагатове. Значна цяжэй «уліцца ў работу» пасля адпачынку. А ўвогуле ў «атамнай» рабоце вельмі дапамагае сям'я, упэўнены наш герой. Яго бацькі, як і бацькі жонкі Юліі — таксама атамшчыкі. Больш за тое, дарагая палавіна Сяргея Горына — вядучы спецыяліст па арганізацыі навучання персаналу ў вучэбна-трэніровачным цэнтры БелАЭС. А яго бацька Уладзімір Дзмітрыевіч — намеснік галоўнага інжынера атамнай электрастанцыі і начальнік вучэбна-трэніровачнага цэнтра — адказвае за падрыхтоўку персаналу. Швагер Вадзім Сарокін — начальнік змены рэактарнага цэху. Многія значныя для сям'і даты таксама сімвалічна звязаны з атамнай галіной.

«Трэба разумець, што АЭС — не халадзільнік і не тэлевізар, якія можна ўключыць націсканнем адпаведнай кнопкі і гэтак жа выключыць. Пуск энергаблока — складаны, адказны і шматэтапны працэс».

Сямейства ГОРЫНЫХ: Сяргей, Юля, Ліза, Саша і Максім.

— Як у вас атрымалася гэткая «атамная» дынастыя, улічваючы ўсю складанасць і адказнасць прафесіі?

— І мае, і Юліны бацькі родам з Беларусі, яны сябравалі яшчэ тады, калі мы ўсе жылі ў Кузняцоўску (цяпер гэта горад Вараш) ва Украіне, калі будавалася Ровенская АЭС. Тады, праўда, Юля яшчэ нават не нарадзілася, быў толькі яе старэйшы брат Вадзім. Калі мне было пяць, наша сям'я паехала ў Балакава, а Юліна засталася ў Варашы. Праз нейкі час іх кантакты згубіліся. І вось праз гады я сустрэўся з Вадзімам на будаўніцтве ўжо БелАЭС (аказалася, ён таксама пераехаў у Беларусь). Яго пазнаў па рэзюме мой бацька, і сяброўства аднавілася. Юлія ў той час жыла ў Кіеве — хацела быць як мага далей ад атамнай галіны, але не атрымалася.

Я люблю падарожнічаць, а ў Кіеве ніколі не быў, вось і паехаў паглядзець горад, а спыніўся ў Юлі. І там нахабна пацікавіўся, ці ёсць у яе хлопец. Яна адказала: «Не». «Ну, тады, значыць, будзеш маёй дзяўчынай», — кажу. «А вось і буду», — пагадзілася Юля. Пару разоў я яшчэ да яе прыехаў, адзін раз яна да мяне, а пасля я яе ўжо з рэчамі забраў. У яе і дзень нараджэння, дарэчы, 22 снежня — на Дзень энергетыка.

Цяпер у нашай сям'і трое дзетак. 8-гадовая Ліза ходзіць у трэці клас, а ў 2020-м 6 мая нарадзілія хлопчыкі-двайняты — акурат у той дзень, калі на пляцоўку першага энергаблока даставілі першую партыю ядзернага паліва. Атрымалася двайное свята і зноў нейкі сімвалізм. Сябры жартам прапаноўвалі назваць іх Пратон і Нейтрон, аднак падрастаюць Аляксандр і Максім. Калі ў іх выявіцца аналітычны склад розуму, буду толькі вітаць іх рашэнне таксама пайсці ў атамную галіну.

— Цяпер на вас двайная нагрузка: засцярога ад уплыву і атамнай энергіі, і каранавіруснай. Штосьці змянілася ў рабоце?

— Меры засцярогі ад каранавіруса вельмі падобныя на правілы, якія прадугледжаны для атамшчыкаў у зоне кантралюемага доступу. Кожны абавязаны насіць «пялёстак» — спецыяльны рэспіратар і пальчаткі. Здымаеш іх асаблівым чынам, каб не дакранацца да вонкавай паверхні і ніякія часціцы з амуніцыі на цябе не трапілі. Тыя ж правілы прадугледжаны і для прафілактыкі каранавіруснай інфекцыі, і гэта частка агульнай культуры бяспекі на АЭС.

Атамшчыкі — інтэрнацыянальны народ, запэўнівае Сяргей Горын. На станцыі ў пераважнай большасці працуюць беларусы, аднак шмат і ўкраінцаў, і расіян. Ды і жонка Юля ўкраінка, а дзеці, як і бацька, маюць грамадзянства Расіі.

«Атамныя» выпрабаванні — як на ўсіх станцыях

Цяпер на першым энергаблоку станцыі праходзяць чарговыя выпрабаванні абсталявання ў розных рэжымах.

— Навошта столькі розных праверак?

— Адказ відавочны — каб быць упэўненымі ў бяспечнай рабоце і рэактара, і сістэм бяспекі, і іншага абсталявання. Энергаблок будзе працаваць не адно дзесяцігоддзе. Каб гады яго работы былі паспяховыя, мы павінны цяпер, на этапе вопытна-прамысловай эксплуатацыі, усё добра праверыць. Гэта не наша «вынаходніцтва», а сусветная практыка. Усе выпрабаванні наш першы энергаблок, дарэчы, пераадольвае паспяхова.

— Што зараз адбываецца ўнутры рэактара і як ядзерная энергія становіцца электрычнай?

— Працягваецца кіраваная ланцуговая рэакцыя дзялення ядра урану з выдзяленнем вялікай колькасці цяпла (ядзернай энергіі). Вадкі цепланосьбіт, які цыркулюе праз рэактар, перадае гэтае цяпло ў парагенератар. У ім утвараецца пара, якая прыводзіць у рух турбіну. Механічная энергія пары перадаецца турбагенератару і пераўтвараецца ў электрычную, якая па лініях электраперадачы трапляе ў энергетычную сістэму краіны, а адтуль — у кожны дом. Усё вельмі проста.

Знайшлі работу і маладыя спецыялісты — выпускнікі беларускіх ВНУ, якія з 2014 года працуюць на станцыі. Многія з іх ужо «дараслі» да вядучых інжынераў па кіраванні рэактарам.

— Наколькі звычайна запуск атамнай станцыі расцягнуты па часе?

— Трэба разумець, што АЭС — не халадзільнік і не тэлевізар, якія можна ўключыць націсканнем адпаведнай кнопкі і гэтак жа выключыць. Пуск энергаблока — складаны, адказны і шматэтапны працэс. Этапы фізічнага і энергетычнага пуску ўжо пройдзены. Зараз ідзе вопытна-прамысловая эксплуатацыя. Пасля яе адбудзецца прыёмка энергаблока і пераход да прамысловай эксплуатацыі. Упэўнены, што ўсе этапы мы пераадолеем паспяхова, і наша краіна атрымае надзейны, бяспечны і эфектыўны энергетычны аб'ект, які будзе служыць на карысць людзям і стане асновай энергетычнай бяспекі Беларусі.

Ірына СІДАРОК.
Фота Андрэя САЗОНАВА і з сямейнага архіва ГОРЫНЫХ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Скажыце, доктар!..

ПСУЮЦЬ ЭМАЛЬ І ПРАВАКУЮЦЬ КАРЫЕС? ВЫРАЎНОЎВАЮЦЬ ЗУБЫ!

Стаматолаг — пра папулярныя сёння брэкеты

Вялікая частка людзей мае неідэальныя зубныя рады, а бездакорная ўсмешка — хутчэй, рэдкі падарунак прыроды ці работа артадонта. Выпраўляць прыкус лепш у дзяцінстве, але калі гэты момант упушчаны — не бяда. Сёння мець роўныя зубы даступна многім — стаматалогія валодае самымі рознымі метадамі. Самы, бадай, папулярны з іх — брэкеты. Пра перавагі і недахопы такога лячэння расказала стаматолаг-хірург 7-й гарадской стаматалагічнай паліклінікі Вольга КОМАР.

Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Калі пачынаць?

— Артадантычнае лячэнне — гэта лячэнне зубасківічных анамалій: парушэнне прыкусу, суадносін верхняй і ніжняй сківіцы, скучанасць зубоў. Артадонты займаюцца выпраўленнем гэтых недахопаў рознымі метадамі. Брэкет-сістэмы — гэта няздымны апаратны метад лячэння, ён часцей прымяняецца ў дарослым узросце, калі ўжо маецца пастаянны прыкус, — кажа ўрач.

— З якога ўзросту можна ставіць брэкеты?

— Можна і падчас змешанага прыкусу, калі малочныя зубы мяняюцца на пастаянныя. У такім выпадку гэта першы этап лячэння. Пры наяўнасці адпаведных праблем яно прымяняецца для таго, каб вызваліць месца зубам, якія рэжуцца, рассунуўшы суседнія. Потым, падчас другога этапу, калі прарэзаліся ўсе зубы, клеяць брэкеты і на ніжні, і на верхні рад, і працягваюць выраўноўванне.

Поўная змена зубоў у норме адбываецца да 12 гадоў. І з гэтага ўзросту можна ставіць брэкет-сістэмы.

Тут трэба разумець, што артадантычнае лячэнне — дастаткова доўгае. І найперш павінен быць матываваны сам пацыент, бо яно не такое і простае. Два гады — гэта сярэдні тэрмін лячэння нават пры нязначнай паталогіі. Некаму для дасягення выніку даводзіцца насіць брэкеты і пяць гадоў. І адказны падыход пацыента вырашае вельмі многае. Калі ён выконвае ўсе рэкамендацыі, лячэнне будзе праходзіць хутчэй. Калі ж своечасова не з'яўляецца на карэкцыю, не выконвае прызначаныя рэкамендацыі, напрыклад, датычныя гумавай цягі (калі паміж сківіцамі надзяваюць гумавыя кольцы для ўзмацнення ціску), належнага эфекту не будзе.

Да чаго рыхтавацца?

— Ці патрабуецца пэўная папярэдняя падрыхтоўка перад установкай брэкетаў?

— Безумоўна. Найперш важна маральна саспець. Плюс падрыхтавацца фінансава, бо гэта не танны метад лячэння. Далей на кансультацыі з урачом вызначаюцца паталогія і яе прычыны. Затым пачынаецца этап абследаванняў. Робіцца 3-D і панарамны здымкі, а таксама тэлерэнтгенаграма. Гэта бакавы здымак чэрапа, які дазваляе высветліць, наколькі правільна размяшчаюцца верхняя і няжняя сківіцы і якім чынам нахілены зубы адносна касцявой тканкі. Пасля здымаюцца адбіткі, урач робіць мадэль і разлікі. Насамрэч у артадонтыі шмат геаметрыі і матэматыкі. Потым складаецца план лячэння, які абмяркоўваецца з пацыентам. Апошні вырашае, на што ён згодны, бо часам патрабуецца яшчэ і хірургічнае ўмяшанне.

Неабходная і падрыхтоўка поласці рота. Яе трэба цалкам прасаніраваць, калі маецца карыес ці перыядантыт. Гігіена — вельмі важны пункт. Калі ў пацыента яна дрэнная, то гэта можна лічыць супрацьпаказаннем. Бо брэкеты — дадатковы пункт захавання зубнога налёту. Пры недастатковай гігіене і схільнасці да карыесу ён утвараецца вакол брэкетаў. І пасля іх зняцця прыдзецца ўсе зубы зверху аднаўляць венірамі — вельмі крыўдны вынік, але такія выпадкі здараюцца. Таму пацыенту дадаткова растлумачаць, як правільна чысціць зубы, на што трэба звяртаць увагу.

Часта перад пастаноўкай брэкетаў патрабуецца выдаліць зубы мудрасці. У адрозненне ад далёкіх продкаў нам не трэба ганяцца за мамантам, таму сківіца ў сучасных людзей змяншаецца. І хоць зубы мудрасці захаваліся, але ім недастаткова месца, гэта своеасаблівы рудымент. У маладых людзей часта сустракаюцца выпадкі, калі тыя або не туды прарэзваюцца, або нахілены, або цалкам не прарэзаліся, але месца ў сківіцы займаюць. А гэта той аб'ём косці, які артадонт можа выкарыстоўваць, каб павялічыць прастору для астатніх зубоў пры іх скучанасці. Выдаліць гэтыя зубы — няпросты працэс і даволі расцягнуты па часе, калі ён выконваецца паэтапна.

І толькі пасля ўсяго гэтага ідзе ўстаноўка брэкетаў. Як кажуць артадонты, у пацыента два святы — установка брэкетаў і іх зняцце.

— З якімі нязручнасцямі і складанасцямі сутыкаецца пацыент падчас нашэння гэтага апарата?

— Першы этап — безумоўна, прывыканне. У роце з'яўляецца дадатковая канструкцыя, і ў першы тыдзень, акрамя пэўнай нязвыкласці, ад гэтага незвычайныя адчуванні — зубы пачынаюць рухацца, і гэта даволі балюча пры надкусванні цвёрдай ежы. Пра такія прадукты, як, напрыклад, шашлык, яблыкі, у першы тыдзень даводзіцца забыць. Брэкеты могуць націраць слізістую, але для гэтага ёсць артадантычны воск. У тых месцах, дзе моцна рэжа і слізістая запаляецца, ім заклейваюцца краі брэкетаў, якія выступаюць. Дыскамфорт прысутнічае тыдзень-два.

Гігіена «звычайных» зубоў таксама павінна быць пільнай, хоць там ніякіх складанасцяў няма. А калі ставяць брэкеты, гігіена мусіць перайсці на новы ўзровень. Акрамя шчоткі і пасты, патрабуюцца дадатковыя сродкі. Важна добра вычышчаць зубы, бо рэшткі ежы забіваюцца пад брэкеты. І няма таго натуральнага ачышчэння, якое прадугледжана прыродай. Многія з тых, хто носіць брэкеты, заўсёды маюць з сабой ёршык і маленькую шчотку. Бо непажадана, каб налет доўга знаходзіўся на зубах, каб потым не ўтварыўся камень. Пасля кожнага прыёму ежы варта хаця б спаласнуць поласць рота.

Асноўная гігіена — раніцай і ўвечары. Увечары гэта ўвогуле цэлы рытуал: пачысціць зубы, брэкеты, прайсціся ёршыкам. Можна выкарыстоўваць ірыгатары — яны выдатна вымываюць рэшткі ежы паміж брэкетам і зубам. Ёсць спецыяльныя монапучковыя шчоткі. Яна з кароткай ручкай і невялікім пучком шчацінак — мабільная і доступ паміж брэкетамі і зубамі з ёй лепшы. Ёсць і спецыяльныя артадантычныя шчоткі з выразам пасярэдзіне. Яна агінае брэкет зверху і знізу для больш якаснага ачышчэння. Можна выкарыстоўваць і ніць, але гэта дастаткова складана з брэкетамі. Вось колькі нюансаў адразу дадаецца. Увечары гэта дастаткова доўгі рытуал — да паўгадзіны.

— Калі пацыент прапускае чарговы візіт да артадонта, так званую карэкцыю, можа атрымаць нечаканы эфект у выглядзе дадатковай шчыліны паміж зубамі?

— Гэта ўжо пра адказнасць самога пацыента. Можа з'явіцца дадатковы прамежак паміж зубамі, бо падчас лячэння яны становяцца рухомыя. У залежнасці ад таго, якая сістэма выбрана, карэкцыя адбываецца раз у чатыры або ў восем тыдняў. Спачатку ставіцца самая лёгкая дуга — адаптацыйны варыянт. Потым яны мяняюцца, узмацняецца іх жорсткасць, шчыльнасць. Калі пацыент пратэрмінаваў чарговы візіт — на ранніх этапах, хутчэй за ўсё, нічога не адбудзецца. Але падчас лячэння, калі дуга становіцца больш цвёрдай, пратэрміноўка можа скончыцца ўскладненнямі і ўрачу давядзецца вяртаць зубы назад. Тут пажадана прыходзіць дакладна па прадпісанні доктара.



— Са зняццем брэкетаў з нязручнасцямі, нарэшце, скончана?

— Пасля артадантычнага лячэння пацыент мусіць ад пяці гадоў да канца жыцця насіць рэтэйнер — апарат, які фіксуе зубы ў правільным становішчы. Яго прыклейваюць знутры, толькі на франтальную групу зубоў, каб пасля лячэння зубы не вярнуліся ў ранейшае становішча. У некаторых выпадках на ноч выкарыстоўваюцца індывідуальныя капы, якія трымаюць зубы ў належным стане. Але рэцыдыў часта здараецца, калі пачынаюць прарэзвацца зубы мудрасці і зрушваюць астатнія. Прычым гэта самыя непрадказальныя зубы, яны могуць прарэзвацца ў любым узросце. Таму важна сачыць за гэтым і своечасова звяртацца да ўрача.

Колькі каштуе?

— Што чакае пацыента, які выбірае лячэнне брэкет-сістэмай, з фінансавага пункту гледжання?

— Варыянтаў аплаты шмат. Можна аплаціць лячэнне разава, можна паступова: спачатку пастаноўку брэкетаў, потым кожную карэкцыю і, нарэшце, зняцце. У плане кошту тут таксама ёсць варыянты. Ёсць розныя віды брэкетаў, і ад гэтага залежыць кошт. У залежнасці ад вытворцы ён таксама вар'іруецца — ад сярэдняга да прэміум-класа. Пастаноўка сістэмы сярэдняга класа каштуе 700—800 рублёў на адну сківіцу, прэміум-класа — 1500—1700 рублёў. Кошт карэкцыі не настолькі значны.

— Да якога ўзросту дарослым можна выпраўляць прыкус такім чынам?

— Чым старэйшы чалавек, тым шчыльней косць і тым складаней ідзе лячэнне. Таму лепш гэта рабіць у маладым узросце, калі косць рухавая і лячэнне будзе больш кароткае. У 40 гадоў нярэдка ўжо маюцца пломбы, каронкі, таму могуць узнікнуць пытанні, ці магчыма ўвогуле артадантычнае лячэнне. Гэта будзе даўжэй і складаней.

Калі дзіця расце, усё рухома. І вельмі важна гэты момант не ўпусціць. Калі праразаюцца пастаянныя зубы не ў той плоскасці, лепш звярнуцца да артадонта, бо лячэнне будзе больш хуткае і простае. У гэты час яшчэ ўсё можна выправіць з дапамогай здымных апаратаў — пласцінак, гэта нашмат танней. І тут справа не толькі ў эстэтыцы, яна — усяго толькі прыемнае дапаўненне. Праблема з прыкусам уплывае на скронева-ніжнесківічны сустаў, які ўдзельнічае ў працэсе жавання. А нашы суставы — складаная структура, і аднавіць іх надзвычай складана.

У савецкія часы на тое, ці роўныя зубы менш звярталі ўвагу, і цяпер да мяне прыходзяць пацыенты нават з галаўным болем. І ён таксама можа быць звязаны з суставам, перанапружаннем мышц, бо наш арганізм — адзіная сістэма. Таму выпраўленне прыкусу — лячэнне «з перспектывай». Зноў-такі з-за няправільнага прыкусу, калі зуб трапляе на зуб, яны сціраюцца, павялічваецца нагрузка на сустаў, агаляецца нерв, з'яўляецца адчувальнасць. Таму лепш гэту праблему вырашыць у самым пачатку.

— Ці можна паставіць брэкеты жанчыне ў дэкрэтным адпачынку, пакуль яна знаходзіцца дома?

— Трэба сказаць, што ў момант цяжарнасці іх непажадана ставіць, бо ідзе гарманальная перабудова, арганізм аслаблены, лячэнне можа пайсці непрадказальна, не даць жаданага выніку і з'явіцца ўскладненні. Праз год ці два пасля нараджэння дзіцяці можна пачынаць артадантычнае лячэнне.

— Якія брэкеты лепш выбраць?

— Ёсць варыянты на любы густ — металічныя, керамічныя. Апошнія менш прыкметныя, але з імі ёсць нюанс: брэкет керамічны, а дуга металічная. І ўзнікае трэнне, працэс лячэння становіцца даўжэйшым. Ёсць брэкеты вестыбулярныя, якія мацуюцца на вонкавай частцы зубоў, а ёсць лінгвальныя — прыклейваюцца з унутранай часткі, яны даражэйшыя, бо не такія заўважныя. З іншага боку, брэкеты цяпер папулярныя. Калі раней яны не вельмі віталіся, то сёння многія студэнткі і нават школьніцы аддаюць перавагу брэкет-сістэмам. І самі апараты змяніліся: не такіх вялікіх памераў, як былі раней, сталі больш дасканалыя. У іх нашэнні сапраўды нічога ганебнага няма, гэта паказчык таго, што чалавек сочыць за сваім здароўем.

Канфуцый «прапісаўся» ў Мінску

20 студзеня Беларусь і Кітай адзначаюць 29-ю гадавіну ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж нашымі краінамі. Журналіст Інеса Плескачэўская сустрэлася са старшынёй таварыства дружбы «Беларусь—Кітай», дырэктарам Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ, былым паслом Беларусі ў Кітаі Анатолем ТОЗІКАМ.

СЁННЯ чатырохпавярховы будынак у самым цэнтры Мінска, на вуліцы Рэвалюцыйнай, 19, складана пазнаць: яшчэ пару гадоў таму людзі хуценька прабягалі міма гэтага напаўзакінутага будынка, а цяпер гэта абноўлены светлы дом з вялікімі вокнамі і адзінай такой бібліятэкай. Адзінай, таму што падарыла яе прэсканцылярыя Дзяржсавета КНР, і гэта самая цікавая бібліятэка па Кітаі ў нашай краіне. У названым будынку ёсць яшчэ шмат чаго такога — адзінага ў сваім родзе, звязанага з Кітаем. Не дзіўна: тут размяшчаецца Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ (РІКК). Я прыйшла сюды, каб пагаварыць з яго дырэктарам Анатолем Афанасьевічам Тозікам, з якім мы знаёмыя з тых часоў, калі ён працаваў Паслом Рэспублікі Беларусь у Кітаі. Цікавасць да Кітая аб'ядноўвае нас і сёння.

У кожнага свая асабістая гісторыя з'яўлення гэтай краіны ў жыцці. Анатоль Афанасевіч успамінае, што ў яго жыццё Кітай «уварваўся» ў канцы 2004 года, «калі я быў прызначаны сустаршынёй міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічных адносінах. Але ўпершыню ён паўстаў у 1960-я, калі я вучыўся на гістфаку. Тады савецка-кітайскія адносіны былі вельмі няпростыя — падзеі на Даманскім (востраве. — **«Зв.»**), 1969 год, мы з велізарнай трывогай на тое глядзелі. На шчасце, мае настаўнікі сфарміравалі вельмі правільнае стаўленне да гэтага народа, яго культуры. Не ведаю чаму, але ўсё жыццё ўва мне сядзела думка, што я павінен працаваць у Кітаі, што я там буду. Спачатку гэта здавалася фантазіяй, але, напэўна, калі вельмі чагосьці хочаш...»

Анатоль Тозік не змог расстацца з Кітаем і пасля таго, як вярнуўся ў Беларусь: ён курыраваў пытанні двухбаковага супрацоўніцтва ў рангу віцэ-прэм'ера. Прызнаецца, што калі ў снежні 2014-га сышоў з дзяржаўнай службы, планаваў «пачаць сплачваць даўгі сям'і, вельмі шмат назапасілася спраў за дзесяцігоддзі» і «вельмі добра сябе адчуваў» на пасадзе прафесара кафедры дыпламатычнай і консульскай службы. Але потым Штаб-кватэра інстытутаў Канфуцыя ў Пекіне і родны БДУ зрабілі прапанову, ад якой ён не змог адмовіцца: узначаліць інстытут Канфуцыя ў Мінску. У верасні 2019 года інстытут стаў ўзорным.

— Калі аб'яўлялі аб прысваенні нам гэтага звання, намеснік генеральнага дырэктара Штаб-кватэры інстытутаў Канфуцыя сказаў, што сёння Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства БДУ з'яўляецца, мабыць, найлепшым сярод усіх такіх інстытутаў, а іх цяпер у свеце больш за пяцьсот. Гэта прызнанне нашага ўзроўню, якасці адукацыі і працы.

АНАТОЛЬ Тозік з задавальненнем расказвае пра тое, што ўжо ўдалося, але яшчэ з большым энтузіязмам — аб тым, што трэба будзе зрабіць.

Адзін з новых кірункаў работы, ініцыяваных інстытутам, — падрыхтоўка школьных настаўнікаў кітайскай мовы. Анатоль Тозік упэўнены, што настаўнікаў кітайскай мовы ў нашай краіне катастрафічна не хапае: «На жаль, сітуацыя такая, што ў школах гэтую мову вывучае менш за адзін працэнт вучняў. Гэта вельмі сур'ёзная праблема, і адставанне ў дадзенай сферы пачынае стрымліваць увесь комплекс двухбаковага супрацоўніцтва». Выкладчыкаў-кітаістаў рыхтуюць на філалагічным факультэце БДУ і ў Мінскім лінгвістычным універсітэце, за кошт бюджэту — усяго чалавек дваццаць штогод, а паколькі падрыхтоўка добрая, «гэтых выпускнікоў з задавальненнем забіраюць кітайскія і беларуска-кітайскія арганізацыі, якія працуюць у нас у краіне, іх у адным кітайска-беларускім індустрыяльным парку каля сямідзесяці. Толькі ў 30 школах вывучаюць кітайскую мову. Калі я працаваў віцэ-прэм'ерам і прапаноўваў звярнуць на гэта ўвагу, у міністэрстве адукацыі адказвалі, што «ахвотных няма». А калі я прыйшоў сюды, практычна кожны месяц тэлефануюць з якой-небудзь школы, нават з раённых: «Дапамажыце знайсці настаўніка». Гэта значыць, сітуацыя змянілася, людзі пачынаюць разумець, што сёння веданне кітайскай мовы — гэта дадатковая гарантыя, што чалавек знойдзе цікавую работу з нядрэнным заробкам. Таму сёння попыт пачынае апярэджваць прапанову».

І ў РІКК прыдумалі, як яго задаволіць: рыхтаваць настаўнікаў кітайскай з ліку тых, хто ўжо працуе ў школе і выкладае іншую замежную мову. Эксперымент — два гады навучання за кошт бюджэту — пачалі ў 2018 годзе, а летась адбыўся першы выпуск. Фінансуе гэтую падрыхтоўку Міністэрства адукацыі.

— Вашы слухачы — з усёй краіны?

— З усёй, стараемся, каб з кожнай вобласці былі. Заняткі вядуць найбольш кваліфікаваныя беларускія выкладчыкі кітайскай мовы. А кітайскі бок спецыяльна пад гэты праект даслаў некалькі выкладчыкаў з вучонымі ступенямі і званнямі. Мы стварылі кафедру кітайскай мовы, я думаю, што сёння яна самая моцная ў рэспубліцы. Фармат навучання: два месяцы глыбокага пагружэння ў прадмет у інстытуце, па дзесяць акадэмічных гадзін штодня і два месяцы дыстанцыйна, не завочна: кожны дзень — новыя веды. Раніцай — заданне, увечары — справаздача.

— Вельмі інтэнсіўна!

— У 2018 годзе мы набралі невялікую групу, 16 чалавек. Вытрымалі гэтую дыстанцыю трынаццаць, добрая лічба *(усміхаецца)*. Два чалавекі сышлі па хваробе, а аднаго мы адлічылі за тое, што прапусціў заняткі без уважлівай прычыны. У першы тыдзень яго адлічылі, і два гады я быў спакойны. Цяпер навучаюцца ўжо другі і трэці наборы, 60 чалавек — яны такія няўрымслівыя, ім вельмі цікава. Я чытаю там курс краіназнаўства, мне вельмі падабаецца аўдыторыя. У іх, у адрозненне ад студэнтаў, іншая матывацыя. Студэнты яшчэ думаюць — трэба гэта ім будзе ці не, таму што ўсходазнаўства — вузкая спецыяльнасць. А гэтыя ўжо дарослыя людзі, яны разумеюць, што ім гэта трэба. У такой аўдыторыі я як педагог адчуваю максімальнае прафесійнае задавальненне, разумею сваю патрэбнасць. Таму вырашыў яшчэ ўзяць і курс гісторыі Кітая: не хачу з імі расставацца.

— Пра матывацыю вельмі цікава.

— Яны разумеюць, што адна мова — гэта адна нага, а іншая, ды яшчэ кітайская, — другая, і яны будуць цвёрда стаяць на зямлі. Я лічу, што гэта вельмі важна для выкладчыкаў такіх моў, як іспанская, французская, нямецкая. Імкненне дзяцей вывучаць гэтыя мовы змяншаецца, таму настаўнікі аказаліся ў няпростай сітуацыі. Адна з нашых выпускніц, атрымаўшы дыплом, сказала: «Вялікі вам дзякуй. Я выкладала нямецкую, а ў школе бацькі адмаўляюцца ад яе. І я збіралася ісці выхавальніцай у дзіцячы садок, а цяпер мяне запрасілі ў гімназію». Адну выпускніцу запрасілі выкладаць у Палескі ўніверсітэт, другую — у Інстытут кантролю ведаў. Усе — гэта была мая прынцыповая пазіцыя — здалі міжнародны кваліфікацыйны экзамен HSK, прычым на 4-5 узровень. З чацвёртым узроўнем прымаюць у многія кітайскія ўніверсітэты, а з пятым — у любы кітайскі ўніверсітэт можна паступаць без папярэдняй падрыхтоўкі. Так што гэты праект атрымаўся. Да таго ж нашы выпускнікі пацвярджаюць: узровень падрыхтоўкі, які мы даём, не ніжэйшы, чым на філалагічным факультэце БДУ ці ў МДЛУ. Па гэтым кірунку наш інстытут будзе працаваць і надалей.

— Пандэмія каранавіруса прымусіла інстытут шукаць новыя формы навучання?

— Мы вырашылі паспрабаваць дыстанцыйнае выкладанне — каб людзі маглі пазнаёміцца з мовай без выдачы дыплома. Кітайскія выкладчыкі аказаліся больш падрыхтаваныя да пераходу на дыстанцыйнае навучанне. За імі падцягнуліся і нашы, у нас вельмі дружны калектыў. Бо мы можам людзям, якія ведаюць рускую мову, даць магчымасць вывучаць кітайскую, дзе б яны ні знаходзіліся, нават у Аўстраліі.

— То-бок, вы замахваецеся...

— Замахваемся, ды пасапраўднаму *(усміхаецца)*. Яшчэ адзін кірунак, якім мы даўно займаемся — вывучэнне Кітая, перш за ўсё вопыту палітыкі рэформаў і адкрытасці, з пункту гледжання магчымасці рэалізацыі гэтага вопыту ў нас у краіне. Нам цяпер вельмі важна сфарміраваць нацыянальную школу кітаязнаўства. Кітай сёння імкліва рухаецца да статусу краіны нумар адзін на планеце, і ад яго вельмі многае будзе залежаць у будучыні. Можа быць, ён адыграе вырашальную ролю ў тым, выйдзе чалавецтва з глыбокага сістэмнага крызісу ці не. Ну а для нас важныя яго эканамічны, тэхналагічны і інвестыцыйны патэнцыял. Але гэтую краіну трэба ведаць, і ведаць не на ўзроўні выказвання сяброўства — для гэтага яе трэба вывучаць, вывучаць глыбока. Гэта іншая цывілізацыя, сістэма каштоўнасцяў, калі хочаце, іншая сістэма міжасобасных, карпаратыўных зносін. Трэба ведаць стан асобных галін, іх магчымасці, узровень тэхналогій, каб можна было актыўна выкарыстоўваць усё гэта ў інтарэсах сваёй краіны — канешне, па прынцыпе ўзаемавыгады, узаемнай зацікаўленасці. Я лічу, што апошняе — вялікая стратэгічная задача. Такой школы ў краіне пакуль няма.

Канфуцый сустракае каля ўвахода.

Яшчэ адзін новы кірунак работы інстытута — інфармацыйна-аналітычнае суправаджэнне практычнага двухбаковага супрацоўніцтва. Аўторак абвешчаны кансультацыйным днём — пакуль кансультацыі даюць бясплатна, галоўная мэта, па словах Анатоля Тозіка, — «паглядзець, што людзі хочуць і што мы можам. Цікавасць ёсць, але пакуль вельмі невялікая. Ці то не ведаюць нас, ці то праз пандэмію ўсё затармазілася. Гэта мяне вельмі непакоіць, таму што пандэмія скончыцца, а нашы адносіны з Кітаем — стратэгічныя, і я баюся, каб за гэты час мы не адкаціліся ў аб'ёме, дынаміцы і структуры гэтых адносін».

...МЫ ідзём па будынку інстытута — шыракія калідоры, утульныя аўдыторыі, абсталяваныя па апошнім слове тэхнікі, і Анатоль Афанасевіч не хавае гонару: тут можна праводзіць міжнародныя канферэнцыі самага высокага ўзроўню: вось спецыяльныя кабінкі для забеспячэння сінхроннага перакладу, вось экраны для відэасувязі з усім светам. Тут жа працуе кнігарня, якая спецыялізуецца на выданнях аб Кітаі міжнароднага выдавецтва «Шанец»: вялікі выбар навучальных дапаможнікаў для тых, хто вывучае кітайскую мову, і шмат кніг наконт традыцыі і культуры вялікай краіны. Крама адкрытая для ўсіх — не толькі для тых, хто вучыцца ў інстытуце.

— Фактычна па нашай просьбе ў Беларусі было заснавана выдавецтва «Усходняя культура». Я стараюся прыцягваць сюды ўсё, што звязана з Кітаем. Запрасілі студэнтаў філалагічнага факультэта, якія навучаюцца па спецыяльнасці «кітайская мова», каб яны адчулі сябе ў гэтай атмасферы. Ёсць і яшчэ адзін кірунак, які я лічу вельмі важным. Гэта прапаганда Беларусі ў Кітаі. Маё глыбокае перакананне, што задача інстытутаў Канфуцыя і перш за ўсё нашага інстытута не толькі ў тым, каб знаёміць беларускіх грамадзян з Кітаем, але і каб кітайскіх грамадзян знаёміць з Беларуссю — з беларускай мовай, культурай, з краінай наогул. Вось-вось у Выдавецкім цэнтры БДУ павінен выйсці падрыхтаваны ў Інстытуце падручнік беларускай мовы для кітайскіх студэнтаў.

Сёння ў Кітаі — і гэтая інфармацыя, упэўнена, здзівіць многіх — у 14 універсітэтах працуюць цэнтры вывучэння Беларусі, беларускай мовы і культуры. Беларускую мову вывучаюць у Пекіне, Шанхаі, Цяньцзіне, Сіяні і іншых гарадах. А яшчэ — «я зараз такімі напышлівымі словамі скажу», — усміхаецца Анатоль Афанасевіч:

— Хутка выходзіць вялікі навучальны кітайска-беларускі і беларуска-кітайскі слоўнік, падрыхтаваны нашым інстытутам сумесна з Інстытутам мовазнаўства НАН Беларусі. У нашым двухбаковым супрацоўніцтве гэта насамрэч з'ява. Я лічу, вельмі важная. Мы суверэнная дзяржава, так, у нас дзве дзяржаўныя мовы, але першай у Канстытуцыі запісана беларуская, гэта мова тытульнай нацыі. Але да сённяшняга часу ў нас такога слоўніка не было.

Калі я, уражаная разнастайнасцю кірункаў работы, развітвалася з Анатолем Тозікам, ён сказаў: «Я тут працую ў інтарэсах сваёй краіны і ў інтарэсах Кітая таксама, але толькі па тых кірунках, праблемах, тэмах, якія адпавядаюць інтарэсам абедзвюх краін».

Вельмі шмат планаў.

Інеса ПЛЕСКАЧЭЎСКАЯ,
уласны карэспандэнт газеты
«СБ. Беларусь сегодня», спецыяльна для «Звязды».
Фота Міхаіла ПЯНЬЕЎСКАГА.

Дабрыня

«ЦЁПЛЫЯ ЛАПЫ»

Дзеці і падлеткі з мінскай гімназіі № 14 сабралі «гуманітарную дапамогу» для птушак і бяздомных жывёл

Імкненне спачуваць і дапамагаць — адна з найважнейшых якасцяў, якія вызначаюць цывілізаванага чалавека. Здольнасць да эмпатыі фарміруецца ў дзяцінстве, і без яе немагчыма развіць у чалавеку ўменне суперажываць іншым (наогул жывым істотам), прымаць права навакольных на суб'ектыўнае меркаванне, бачыць свет не аднабакова, а ва ўсім яго харстве і разнастайнасці.

Настаўнікі гімназіі № 14 могуць ганарыцца сваімі выхаванцамі.

— Часам дарослыя лічаць цяперашняе юнае пакаленне «лічбавымі дзецьмі»: абыякавымі і эгаістычнымі. Кажуць, што яны ўваткнуліся ў свае тэлефоны і больш нічога не заўважаюць. Але гэта не так, — перакананая **педагог-арганізатар гімназіі № 14 Мінска Вольга КОРХАВА.** — Наадварот, іх нельга папракнуць у эгаізме: яны заўсёды адгукаюцца, калі нехта мае патрэбу ў дапамозе. І гатовыя зрабіць нават больш, чым прапануюць настаўнікі.

Акцыя «Цёплыя лапы» пачалася з малодшых класаў — з надыходам маразоў Вольга прапанавала дзятве сабраць проса, каб засыпаць яго ў кармушкі для птушак на школьным двары.

— Я не чакала, што да нашай акцыі далучацца і навучэнцы 5-8 класаў, і старшакласнікі. Гімназісты вырашылі пайсці далей: сабраць корм і неабходныя рэчы для бяздомных катоў і сабак. У гэтым нас падтрымалі валанцёры дабрачыннага руху «Разам», — распавядае суразмоўніца.

Уласна кажучы, гэта не першая падобная акцыя ў гімназіі: у мінулыя гады школьнікі ўдзельнічалі ў выстаўцы-кірмашы творчых работ, а атрыманыя сродкі адпраўлялі ў фонды дапамогі бяздомным жывёлам. У мінулым і гэтым годзе ў сувязі з пандэміяй такая форма работы стала немагчымая. Але абставіны не перашкодзілі дзецям зрабіць свет крыху дабрэйшым.

— Навучэнцы прыносілі не толькі проса і корм для катоў і сабак (часам цэлымі пачкамі, часам — у цэлафанавых мяшочках: адсыпалі запасаў для сваіх гадаванцаў). Прыносілі ланцужкі, ашыйнікі, спецыяльныя пялёнкі для кацянят і шчанюкоў, цёплыя домікі для гадаванцаў — і набытыя, і зробленыя сваімі рукамі. «Сабачай» і «кацінай» ежы было сабрана вельмі шмат. Днямі мы ўрачыста перадалі ўсе гэтыя рэчы валанцёрам. Мы ганарымся нашымі вучнямі. Думаю, нават нам, дарослым, часам можна павучыцца ў дзяцей дабрыні і прыгажосці душы.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Крэатыў

Рабакоп, дзядзя Сцёпа і Валодзя Шарапаў

Магілёўскі інстытут МУС правёў своеасаблівую прафарыентацыю ў стылі касплея

Сёння стварэнне вобраза ўпадабанага героя кіна-, мультфільма, становіцца вельмі папулярнай з'явай сярод моладзі. І магілёўская вышэйшая ўстанова, дзе рыхтуюць міліцэйскія кадры, вырашыла гэтым скарыстацца, каб прыцягнуць да сябе ўвагу моладзі.

— Мы зацікаўлены ў тым, каб да нас прыходзілі неабыякавыя да справы людзі, а інтарэс да прафесіі заўсёды пачынаецца з чагосьці яркага і запамінальнага, — кажа афіцыйны **прадстаўнік Магілёўскага інстытута МУС Кірыл МАРЖАНАЎ.** — Напэўна, шмат каму запаў у душу вобраз міліцыянера. Мы прапанавалі ператварыцца ў любога персанажа з міліцэйскімі пагонамі і паўдзельнічаць у нашым конкурсе «Вы мой герой!». Трэба было размясціць сваё фота ў сацыяльнай сетцы Instagram, суправадзіць яго выявай арыгінала і напісаць невялікае абгрунтаванне, чаму абраны менавіта гэты герой. Адгукнулася больш чым дзвесце чалавек.

Мяркуючы па тым, што на конкурс прыйшло некалькі дзясяткаў варыянтаў дзядзі Сцёпы, персанаж савецкага пісьменніка Сяргея Міхалкова карыстаецца вялікай папулярнасцю і ў сучаснай моладзі. Некалькі ўдзельнікаў прымералі на сябе вобразы брутальнага Глеба Жыглова і абаяльнага Валодзі Шарапава з кінастужкі «Месца сустрэчы змяніць нельга». Шмат хто згадаў міліцыянераў з эксцэнтрычных савецкіх кінакамедый «Брыльянтавая рука» і «Аперацыя Ы». Не меншай папулярнасцю карыстаюцца героі папулярных расійскіх серыялаў «Глухар», «Каменская», «Паліцэйскі з Рублёўкі». Знайшоўся нават «двайнік» з вядомай амерыканскай франшызы 1990-х — «Рабакоп». Разам з цудоўнымі фота прыйшлі і вельмі кранальныя прызнанні.

— Для мяне любімы вобраз — дзядзя Сцёпа, — адзначыў Уладзіслаў Качук з Курылавіцкай сярэдняй школы Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці. — Імпануе, што ён добры, моцны і вясёлы. У дзяцінстве вельмі любіў глядзець гэты мультфільм і марыў сустрэцца з яго героем.

— Мне падабаецца ў трусе Джудзі Хопс тое, што яна заўсёды прытрымліваецца сваёй мэты і дамагаецца вялікіх вынікаў, — напісала вучаніца сярэдняй школы № 21 горада Бабруйска Ганна Кунічык пад сваім здымкам у касцюме гераіні мультфільма «Звераполіс».

Вучань Лучнікоўскай сярэдняй школы з Мінскай вобласці Максім Біч нават вонкава аказаўся падобны на свайго куміра — Уладзіміра Шарапава. Здымак атрымаўся вельмі каларытны за кошт таго, што аўтар вельмі добра папрацаваў над элементамі свайго адзення. Наогул удзельнікі ўразілі сваім творчым падыходам да справы. Антон Даніленка, вучань Сялецкаўскай сярэдняй школы Касцюковіцкага раёна, напрыклад, з падручнага матэрыялу змайстраваў касцюм таго самага Рабакопа.

— Мы былі вельмі ўражаны такой актыўнасцю моладзі, — кажа Кірыл Маржанаў. — Вельмі прыемна, што нашы ўдзельнікі настолькі дасведчаныя і прасунутыя. Яны цікавяцца не толькі сучаснымі кінатворамі, але добра ведаюць і савецкае кінамастацтва. На жаль, складаная эпідсітуацыя не дазволіла запрасіць пераможцаў да нас, каб узнагародзіць іх у сценах Магілёўскага інстытута МУС. Дыпломы і падарункавыя сертыфікаты мы накіравалі ім поштай. У найбліжэйшы час плануем арганізаваць шэраг падобных конкурсаў у дыстанцыйным рэжыме. Яны таксама будуць накіраваны на папулярызацыю нашай прафесіі і фарміраванне станоўчага іміджу інстытута. Абяцаем зрабіць гэта цікава. Так што сачыце за анонсамі на нашым сайце і ў сацыяльных сетках.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Магілёўскага інстытута МУС.

УВЕДОМЛЕНИЕ

о проведении общественного обсуждения архитектурно-планировочной концепции объекта: «Комплексная реконструкция общежития № 1 для слушателей по ул. К. Маркса, 22А, и здания по ул. К. Маркса, 22В, в г. Минске»

Администрация Ленинского района г. Минска приглашает принять участие в проведении общественного обсуждения архитектурно-планировочной концепции объекта «Комплексная реконструкция общежития № 1 для слушателей по ул. К. Маркса, 22А, и здания по ул. К. Маркса, 22В, в г. Минске» (далее – проект) в форме информирования и анализа общественного мнения.

Академия управления при Президенте Республики Беларусь является головным учреждением высшего образования страны по подготовке, переподготовке и повышении квалификации кадров в сфере управления. Однако резкая нехватка учебных площадей ограничивает возможности учреждения образования. Раздробленность расположения корпусов создает сложности для слушателей. Целью проводимой комплексной реконструкции является ликвидация существующих проблем организации работы учреждения образования как целостной структуры и увеличение объемов высококвалифицированной подготовки.

Проектируемый участок площадью 0,3835 га (в границах работ) располагается на земельном участке, представленном для эксплуатации и обслуживания зданий общежитий по ул. К. Маркса, 22А и 22Б, здания специализированного для образования и воспитания по ул. К. Маркса, 22 и здания многофункционального по ул. К. Маркса, 22В.

Проектом предусматривается реконструкция существующих зданий общежития № 1 и гаража, расположенных на данной территории. Генеральный план запроектирован с учетом сложившейся ситуации и ландшафтных особенностей участка, увязан с существующей застройкой и проездами. Вся территория ограждена. Предусмотрено выполнить замену ограждения территории на новое металлическое решетчатое ограждение по трассе существующего. Транспортное обслуживание объекта осуществляется с ул. К. Маркса по существующим проездам на территории через шлагбаумы. Проезд обеспечивает доступность к общежитию, гаражу, внутридворовой территории и площадкам для мусоропроводов.

С целью создания комфортной среды предусматривается комплексное благоустройство территории с организованной сетью пешеходных связей с соблюдением требований по безбарьерному передвижению в увязке с озеленением участка и расстановкой малых архитектурных форм. На участке имеются существующие парковки. В связи со стесненными условиями проектом предусмотрены парковки на 8 м/мест (в том числе 2 м/места для автомобиля инвалидов), а также 3 м/места в составе гараж-стоянки учебного корпуса.

Объемно-пространственное решение объекта выполнено с учетом применения современных строительных материалов и конструкций, прошедших сертификацию на соответствие требованиям пожарной, экологической, санитарной безопасности и в соответствии с действующими документами национальной системы нормирования и стандартизации.

Архитектурный объем здания учебного корпуса запроектирован с учетом обеспечения нормативной инсоляции существующей застройки. Для формирования фасадов и увязки с соседними зданиями используются архитектурные детали, цветовые решения, типичные для окружающих зданий.

Общественное обсуждение по данному проекту состоится в период с 01.02.2021 по 25.02.2021 (включительно) в форме информирования и анализа общественного мнения.

Экспозиция (выставка) проекта будет располагаться с 01.02.2021 по 15.02.2021 (включительно) на цокольном этаже здания администрации Ленинского района г. Минск (ул. Маяковского, 83, пн.–пт. 9.00–18.00), а также будет размещена на официальном сайте администрации района http://lenadmin.gov.by, в разделе «Общественные обсуждения».

Презентация проекта состоится 03.02.2021 в 17.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 22А (здание общежития № 1, фойе).

Организатор общественного обсуждения – администрация Ленинского района г. Минска, заказчик – Академия управления при Президенте Республики Беларусь.

В период с 01.02.2021 по 25.02.2021 (включительно) свои письменные замечания и предложения можно оставить в журнале замечаний и предложений, который будет находится на цокольном этаже здания администрации Ленинского района г. Минска (ул. Маяковского, 83, пн.–пт. 9.00–18.00) или направить на почтовый адрес (индекс 220006, г. Минск ул. Маяковского, 83, каб. 204, 206 тел./факс: 379 81 41, тел.: 379 99 03), либо на адрес электронной почты: len.stroi@minsk.gov.by.

Рассмотрение замечаний и предложений участников общественного обсуждения и подведение итогов будет осуществляться архитектурно-градостроительным советом при комитете архитектуры и градостроительства Мингорисполкома.

Уведомления о проведении общественных обсуждений размещены:

- на информационных стендах администрации Ленинского района г. Минска;

- в электронном виде – на официальном сайте администрации Ленинского района г. Минска в разделе «Общественные обсуждения» (http://lenadmin.gov.by).

УНП 100035734

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «1-я Минская птицефабрика» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:

Лот № 1 (повторный): здание пилорамы (инв. № 250019) с инв. № 600/С-158817 общей площадью 1088,4 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623681300001000563 площадью 0,1229 га (право постоянного пользования) по адресу: Минский район, Горанский с/с, 33, район аг. Чачково.

Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона ручья № 6, пл. 0,1229 га.

Начальная цена объекта с НДС (20 %) – **73 200,00** бел. руб. *Цена снижена на 50 %.* Задаток 10 % от начальной цены **(7 320,00 бел. руб.).**

Лот № 2: телятник с инв. № 600/С-118890 общей площадью 1008,3 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 623685800001000105 площадью 0,8809 га (право постоянного пользования) по адресу: Минский район, Шершунский с/с, 25, район д. Новый Двор.

Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электропередачи напряжением свыше 10кВ, пл. 0,1760 га.

Начальная цена объекта с НДС (20 %) **– 165 434,36** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены **(16 543,00 бел. руб.).**

Лот № 3: административное здание *(составные части и принадлежности: навес)* **с инв. № 600/С-169644 общей площадью 416,9 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623685813601000266 площадью 0,0741га (право постоянного пользования) по адресу: Минский район, Шершунский с/с, д. Новый Двор, ул. Парковая, 16.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона ручья № 36, пл. 0,0741 га.

Начальная цена объекта с НДС (20 %) **– 73 307,81** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены **(7 330,00 бел. руб.).**

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере, включающее затраты на организацию и проведение аукциона: по лотам №№ 1, 3 – 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лоту № 2 – 3 (трех) процентов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **24.02.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.02.2021** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.
Тел. для осмотра: 017 504-83-58, 029 139-34-00, 029 162-40-72

УНН 600068728

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5**
Продавец	**ОАО «Управляющая компания холдинга «Бобруйскагромаш», Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, 5**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов

Лот № 1
Месторасположение:
Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 13

Производственная база в составе: **производственный корпус ГСПКТБ № 1** (инв. № 710/С-13026, 2980,4 кв. м), **здание склада нефтепродуктов** ((инв. № 710/С-13003, 86 кв. м, составные части: пристройка), **здание автомобильных весов** (инв. № 710/С-13004, 29 кв. м), **площадки и проезды** (инв. № 710/С-74589, 6580 кв. м, составные части: площадки бетонные, дорожка, асфальтобет. площадка и проезд), **ограждение территории** (инв. № 710/С-80801, 350,45 м, составные части: ограждения наружное метал. корпуса, внутрен. территории, площадки для мусора (деревян.), ограждение (контейнер с отходами), система пожаротушения (инв. № 00826).
Сведения о земельном участке: пл. **1,4348 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения. Ограничения (обременения) прав: сервитут

Обременения: на территории лота № 1 расположено защитное сооружение гражданской обороны, которое не входит в состав лота. После продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута

Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 918 295,70 бел. руб.
(снижена на 30 %)

Лот № 2
Месторасположение:
Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 13

Здание инженерного корпуса (инв. № 710/С-2146, 4561,3 кв. м, составные части: автостоянка личного автотранспорта, лифты), **площадки и проезды** (инв. № 710/С-80804, 510 кв. м), **внутриплощад. сети хозфекал. канализации** (инв. № 710/С-80813, 667,6 кв. м), **сети водоснабжения** (инв. № 710/С-80814, 445,1 кв. м), теплообменник (инв. № 70156), теплообменник ПВВ-07*114*2000 (инв. № 70154), теплосчетчик ТЭРМ-02-6 (инв. № А4006), регулятор температуры (инв. № 70157), электрич. сети и учет (инв. № 70180)

Обременения: площади здания частично сданы в аренду. Здание инженерного корпуса находится в залоге у ОАО «Белагропромбанк». Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 1 472 064,79 бел. руб.
(снижена на 30 %)

Лот № 3
Месторасположение:
Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 13

Здание столовой с конференц-залом (инв. № 710/С-5685, 1934 кв. м), **площадки и проезды** (инв. № 710/С-80806, 466 кв. м, составные части: площадки, дорожки, клумба, ограждение), холод. агрегат АРТХ-5 (инв. № 44047), КТП-28 (инв. № 09224)

Обременения: здание столовой и конференц-зала находится в залоге у ОАО «Белагропромбанк». Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 609 436,80 бел. руб.
(снижена на 20 %)

Сведения о земельном участке по лотам № 2 и № 3: пл. **1,0839 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений производ. назначения. Ограничения (обременения) прав: после продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута

Лот № 4
Месторасположение:
Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 13

Площадка (инв. № 710/С-74591, 428 кв. м) **с ограждением наружным металлическим корпуса** (инв. № 710/С-80803, 21,97 м).
Сведения о земельном участке: пл. **0,0622 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений производ. назначения

Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 23 205,39 бел. руб.
(снижена на 40 %)

Задаток по лотам № 1 и № 2 – 1 %, по лотам № 3, № 4 – 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Извещения о проведении предыдущих электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 20.11.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: 11.00 02.02.2021. Окончание торгов: 12.00 02.02.2021.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 01.02.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

Контактные телефоны:
+375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ТОРГАХ (В ФОРМЕ АУКЦИОНА)

ГОРОДОКСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ

26 февраля 2021 года в 14.00 в здании Городокского райисполкома, расположенного по адресу: Витебская область, г. Городок, ул. Пролетарская, 2 (малый зал, каб. 110), проводит торги в форме аукциона на право заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства (длиннопалого (узкопалого) рака (Astacus leptodactylus) на территории следующих водных объектов Городокского района Витебской области:

Наименование водоема	Местонахождение, площадь, га	Промысловый запас, предельно допустимый объем изъятия рака	Начальная цена предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
озеро Берново	22 км на северо-запад от г. Городка у дер. Вировля, 280,4 га	1300 кг, 600 кг	20 базовых величин	50 % начальной цены предмета аукциона
озеро Лосвидо	7 км на юг от г. Городка, у дер. Большое Лосвидо и дер. Малое Лосвидо, 1167,0 га	3700 кг, 1700 кг	20 базовых величин	50 % начальной цены предмета аукциона

**Примечание: оплата производится в белорусских рублях исходя из размера базовой величины, установленной на день оплаты.*

Организатор – Городокский районный исполнительный комитет, 211573, Витебская область, г. Городок, ул. Пролетарская, 2, контактные телефоны: 8 (02139) 58132, факс (802139) 45320.

Для участия в аукционе приглашаются юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь.

Участникам необходимо в адрес организатора представить:

- заявление, с указанием на какой территории и какие виды диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, предполагается заготавливать и (или) закупать по результатам торгов;
- копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий счет организатора аукциона, заверенную банком;
- юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;
- индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;
- представителям юридических лиц или индивидуальных предпринимателей представить доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя, а руководителям юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Документы, необходимые для участия в аукционе, принимаются организатором аукциона по адресу: 211573, Витебская область, г. Городок, ул. Пролетарская, 2, каб. 214 (с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 по рабочим дням понедельник–пятница).

Последний день приема документов – **22 февраля 2021 года до 17.00.**

Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет ГУ Министерства финансов Республики Беларусь по Витебской области: BY95AKBB36003160071060000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНН 300594330, код платежа в бюджет 04005. Порядок внесения задатка – единовременно.

Аукцион проводится в соответствии с Правилами добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, утвержденных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 июня 2006 г. № 699.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Задатки участникам, не ставшим победителями, возвращаются в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Участнику, выигравшему торги, сумма внесенного задатка учитывается в счет возмещения затрат на организацию и проведение торгов, изготовление документации, необходимой для их проведения.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявка (заявление) на участие в нем подана только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведение аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан:

- подписать протокол аукциона;
- не позднее 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, а также оплатить приобретаемый предмет аукциона путем перечисления денежных средств на расчетный счет организатора аукциона до принятия решения Городокского районного исполнительного комитета.

Для участника, ставшего победителем аукциона, при осуществлении заготовки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства (длиннопалого (узкопалого) рака) способом добычи диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства (длиннопалого (узкопалого) рака), является только использование раколовок как орудий добычи таких животных.

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

извещает о проведении 23.02.2021 открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Могилевдрев»

Лот № 1: Форвардер Амкодор 2661, 2010 г. в, р/з ТВ-6 8952, з/н 0100101, инв. № 00710279. Местонахождение: г. Могилев, пер. Гаражный, 10.
Начальная цена продажи – 80 000.00 бел. руб. с НДС. Сумма задатка – 8 000.00 бел. руб.

Лот № 2: Харвестер Амкодор 2551, 2011 г. в, р/з ТВ-6 8951, з/н 0077, инв. № 70. Местонахождение: г. Могилев, пер. Гаражный, 10
Начальная цена продажи – 80 000.00 бел. руб. с НДС. Сумма задатка – 8 000.00 бел. руб.

Лот № 3: Грузовой автомобиль ZIL-131, 1983 г. в, р/з АВ 1407-6, № кузова (рама) 556103, цвет – зеленый, тип – грузовой фургон, инв. № 2814. Местонахождение: г. Могилев, пер. Гаражный, 10.
Начальная цена продажи – 4 992,00 бел. руб. с НДС. Сумма задатка – 499,20 бел. руб.

Аукцион состоится 23 февраля 2021 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона **ino.by.** *Информация о предыдущем аукционе была опубликована в номере газеты «Звязда» от 23.10.20.*

Организатор аукциона: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 351, 352, **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703**
Продавец	**ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38. Тел. + 375 29 688-04-88**

Предмет аукциона

Лот № 1
Местоположение **– г. Минск, ул. Замковая, д. 33-6**

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер
Административно-торговое помещение	733,5 кв. м	500/D-7023833

Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 2 605 200,00 бел. руб.
Шаг аукциона – 130 260,00 бел. руб.

Лот № 2
Местоположение – **г. Минск, ул. Замковая, д. 33-1а**

Кабинеты (административное помещение)	87,9 кв. м	500/D-708041778

Составные части и принадлежности: открытая автостоянка пл. 523 кв. м

Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 476 400,00 бел. руб.
Шаг аукциона – 23 820,00 бел. руб.

Порядок ознакомления: в рабочие дни по предварительному согласованию, +375 (29) 680-80-99 (Шубко Юлия Владимировна)

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения аукциона.
С подробной информацией о перечне представляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации или явки на аукцион одного участника, предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене увеличенной на 5 %

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона: предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона, исчисляемое в процентном соотношении от цены продажи (2 % – по лоту № 1; 3 % – по лоту № 2) в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 29.12.2020

Дата и время проведения аукциона	**02.02.2021 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Дата, время начала и окончания приема заявлений	**С 09.00 21.01.2021 до 17.00 29.01.2021 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.
E-mail: auction@ipmconsult.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 212 24-63-12, +375 29 510-07-63.

Продавец: открытое акционерное общество «Доваторский», Республика Беларусь, Витебская область Шарковщинский район, аг. Пялики, тел.: 8 (02154) 65441, 8 (02154) 65403.

Лот № 1. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 223/U-9540, назначение – сооружение неустановленного назначения, расположенное по адресу: Витебская обл., Шарковщинский р-н, Радюковский с/с, д. Буки, ул. Полевая, 1А. Составные части и принадлежности: шахтный колодец литер Д – готовность: 80 %, материал – железобетон; ограждение для вольеров литер Е – готовность: 50 %, высота: 2.00 м, длина: 190,37 м; мини-кафе на 30 посетителей литер А(А1/д) – готовность: 41 %, площадь застройки – 120 кв. м; два гостевых домика литеры Б (Б1/д), В (В1/д): готовность гостевого домика литер Б (Б1/д): 19 %, площадь застройки – 27 кв. м, готовность гостевого домика литер В (В1/д) – 19 %, площадь застройки – 58 кв. м; домик рыбака литер Г(Г1/д) – готовность: 54 %, площадь застройки: 44 кв. м. Объект расположен на земельном участке с кадастровым № 22558170001000003 2 (договор аренды земельного участка по 02.02.2065) площадью 1,5052 га по адресу: Витебская обл., Шарковщинский р-н, Радюковский с/с, д. Буки, ул. Полевая, 1А, целевое назначение – земельный участок для строительства и обслуживания объекта придорожного сервиса. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Нач. цена: 43 101,22 бел. руб. с НДС. Задаток: 4 310,12 бел. руб.

Дата, время и место проведения торгов: 22.02.2021 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 20.01.2021 с 08.30 по 19.02.2021 до 17.30. **Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» №BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК МТВКBY22, УНП 390477566. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Условия аукциона**: Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона; заключить договор купли-продажи в течение 14 рабочих дней с даты проведения торгов, оплатить предмет торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. **Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609.** Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона.

Доп. информацию можно получить по тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 29 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

Конт. лицо для осмотра объекта: Перхурович Олег Мечеславович, конт. тел. +375 (33) 346-59-99.

МЫ ПЛАНУЕМ, А БОГ СМЯЕЦЦА?..

Але ж калі-нікалі смяёмся і мы

Што праўда, тое праўда: на «Звязду» можна падпісацца заўжды — з любога месяца і ў любым аддзяленні паштовай сувязі. Ведаючы гэта, тым разам, па дарозе з грыбоў, збочылі ў сціплае вясковае, падалі ў акенца паперку з адрасамі, сказалі: «Нам, калі ласка, «Звязду»... На квартал».
Рэакцыя спадабалася: «Ой, а я ж таксама гэту газету выпісвала! — прызналася жанчына, што стала побач... Там яшчэ рубрыка была «...Народ на провадзе!» — «Дык яна, — «суцешылі», — і сёння ёсць! Выходзіць кожную пятніцу». — «Ды быць такога не можа!» — здзівілася жанчына. — «Можа-не можа, — «скаламбурылі» мы, — але ж ёсць» і...

«Я неяк падлічыла, што нашаму «праводу» хутка 20, — **піша спадарыня Соф'я Кусянкова з Рагачоўчыны.** *— Сур'ёзная дата! Такую — не грэх бы і адзначыць! Як? Тут варыянтаў шмат. Першая думка — пагартаць старыя газеты, перачытаць ранейшыя падборкі (а гэта ж, мусіць, цэлая эпапея?) і ўсе самыя цікавыя гісторыі надрукаваць яшчэ раз — «на біс», калі можна так сказаць, альбо «па заяўках працоўных»... Бо ім жа (то-бок нам, працоўным) вельмі шмат што помніцца, прычым гадамі, а то і дзесяцігоддзямі, шмат што перадаецца з вуснаў у вусны. Вось мне, напрыклад, у памяці «Слова не верабей» Кароткіна, «Доктар? Чараўнік» Курсевіча, «Прасіць трэба з розумам» Багер, «Бабуліны трусы» (аўтара ўжо не помню, бо даўно друкавалася...). А таму — нехта чытаў ды забыўся, нехта не выпісваў тады газету, а зараз, згадзіцеся, як знайшоў бы!*

Да таго ж чытачы змаглі б паглядзець, які «Народ...» быў тады, на пачатку стагоддзя (аб чым і як ён пісаў), а які стаў цяпер. На мой погляд, — лічыць спадарыня Соф'я, *— розніца быць павінна».*

«Што відавочна, — піша чытачка, *— ёсць яна і ў нашага «аўтарскага цэха»: хто-ніхто (мусіць, з розных прычын?) з яго «звальняецца», хто-ніхто — наадварот — прыступае да працы. Прыемна бачыць новыя прозвішчы і разумець, што ёсць газета, у якой (апроч іншага) можна расказаць сваю гісторыю і тым самым пасмяшыць, парадаваць іншых... Ды і сябе таксама. Я, напрыклад, да сёння помню, колькі шчасця было, калі ўбачыла ў газеце свой першы творык, колькі кампліментаў пачула тады ад людзей! У мяне ад іх ажно крылы выраслі! І, між іншым, далёка «занеслі»: з таго дня на старонках «Звязды» выйшла аж 130 маіх гісторый. Асобныя з іх (сам сябе не пахвалі, дык так і памрэш), ну напэўна ж, заслугоўвалі не толькі прызавых месцаў, але і перадрукоўкі на біс!..»*

«А таму (гэта маё цвёрдае перакананне), — заяўляе Соф'я Парфір'еўна, *— рубрыцы быць! І конкурсу, дай бог, таксама. Адзінае, што сёлета — на карысць іншых — я адмовілася б ад узнагароды (калі такая выпадзе) і ад «пасады» старшыні вялікага чытацкага журы. Пяць гадоў... Напэўна, ж хопіць? Іншым трэба дарогу даць... Тым больш што ў нас хапае людзей з вострым пяром і пачуццём гумару, з жаданнем ацэньваць іншых. Вось такому б чалавеку і «лейцы ў рукі»! Няхай кіруе!»*

Нешта ў гэтых прапановах, здаецца, ёсць? Ці не так? Давайце абмяркуем?

А пакуль — яшчэ некалькі лістоў. *«Ужо каторае дзесяцігоддзе, —* піша **спадарыня Алена Маркава з Мінска**, *— я выпісваю «Звязду», чытаю гісторыі са звяздоўскага «праводу» і дзіву даюся, адкуль яны бяруцца, чаму не канчаюцца?! А галоўнае — усе і сапраўды цікавыя, вясёлыя, павучальныя... Многія з іх я захоўваю ў спецыяльнай папцы, каб яшчэ раз перачытаць самой, каб парадаваць сваіх сяброў і вучняў... Словам, па крупінках збіраючы і распаўсюджваючы беларускі народны гумар, наша «Звязда» і яе чытачы робяць вялікую добрую справу. За гэта — мой нізкі паклон!»*

«У фільме «Безыменная зорка» грамада, як вы помніце, збіралася на вакзале, — нагадвае **спадарыня Зоя Наваенка з Глыбоччыны,** *— а ў нашым Падсвіллі — на базары. Людзі з'язджаюцца на іх па чацвяргах, каб нешта прадаць ці купіць, каб пабачыцца... Дык вось неяк раз да мяне там падышоў незнаёмец і сказаў* (літаральна)*: «Дзякуй вам за вашу пісаніну. Кожны дзень чакаю «Звязду» і гляджу, вы ёсць там ці не...»*

Гэтыя словы, як я потым зразумела, — працягвае шаноўная чытачка, *— не столькі пра мяне, колькі пра ўвесь «калектыў» аўтараў з таго ж «Праводу», бо селі мы з мужам перачытваць гісторыі, змешчаныя ў 2020-м, і міжволі ўспомнілі... шапку Манамаха. Яна, як вядома, была досыць цяжкой ад золата, з якога зроблена, ды каштоўных камянёў... Тое ж самае можна сказаць і пра «збор» вясёлых гісторый. Чытаць іх гадзінамі, запар, адну за адной неяк не выпадала, бо многія хацелася яшчэ раз абдумаць, «перавараць», асобныя — абмеркаваць... А вось ацаніць ды выбраць найлепшыя — па-сапраўднаму цяжка!*

Не ведаю, як іншыя, мы з мужам зыходзілі з простага: ці ўсміхаліся, ці здзіўляліся, чытаючы? І што потым запомнілі? Спісак свой дадаём, але ж разам з высновай, што рубрыка — цікавая і патрэбная, што «Праваду» быць!»

Тое ж чытаем і ў лісце **спадара Багуслава Боўбеля з Мінска:** *«Вясёлыя і праўдзівыя гісторыі...», без перабольшвання, упрыгожваюць газету, —* лічыць чытач, *— робяць яе непадобнай да іншых. А таму нельга абрываць гэты «Провад»! Няхай ён служыць, хай людзі і надалей успамінаюць сваё, пішуць, чытаюць іншых. Гэта, вядома ж, на карысць... Што датычыцца найлепшых апавядальнікаў, то тут без сумненняў: першыя месцы трэба аддаваць спадарыням Любові Чыгрынавай (я налічыў ажно 11 яе бываліц), другое — Соф'і Кусянковай и Зоі Наваенцы... А зрэшты, многія аўтары варты ўзнагарод. Асабліва — за гісторыі ў вершах».*

І лісты, — трэба разумець — таксама?

Шмат пісаў народ
у «Провад»
(Нам, пісакам,
абы повад...)
Потым марыў усур'ёз,
Як складзецца
ў «байкі» лёс:
Як патрапіць у газету
Не падрэзанай пры гэтым,
І як будзе ў навіну
Усім чытаць пра даўніну,
Пра жыццё вясковае,
Школьнае, вайсковае,
Пра суды, хваробы, святы,
Пра гаротных і багатых,
Пра сюрпрызы і труну
(Можа, нават не адну?),
Пра канцэрты і мароз,
Крадзяжы, падман,
склероз,
Пра вясёлых мужыкоў —
Грыбнікоў і рыбакоў,
Пра свякроў,
пра цешчу, жонку...
Шмат было
пра самагонку,
(Столькі, можа,
і не варта б?),
Ды жыццё дыктуе жарты,
А без жартаў —
не пражыць.
Значыць «Праваду»
ў нас быць!

Настойвае на гэтым **спадарыня Любоў Чыгрынава з Мінска** і прапануе свае новыя гісторыі.

Што да старых, змешчаных у прамінулым 2020-м, то вялікае чытацкае журы і гэтым разам аддало свае сімпатыі творам **спадарынь Соф'і Кусянковай з Рагачоўшчыны і Любові Чыгрынавай з Мінска** (праўда, тут галасы раздзяліліся паміж гісторыямі «Макаранка адпачывае» (26.07) і «Любіў цалаваць, любі і калыхаць» (02.10)...

Той жа «малюнак» з «...Сапраўдным палкоўнікам» (24.01) і «Сюрпрызам для класнага» (28.02) **спадарыні Зоі Наваенкі з Глыбоччыны.**

Але ж ёсць выпадкі, дзе сімпатыі супалі, прычым — амаль аднадушна! Такім чынам:

ДРУГОЕ МЕСЦА (бо першае маленькае рэдакцыйнае журы вырашыла сёлета не прысуджаць) за вершаванымі гісторыямі **спадароў Міколы Камароўскага з Оршы** «Не было б шчасця, ды няшчасце памагло...» (22.05) і **Віктара Сабалеўскага з Узды** «Гулі і пана разулі!» (25.08).

ТРЭЦЯЕ МЕСЦА за гісторыямі «Старанны Іванчык» (4.01) **спадарыні Ніны Кандрашонак з Петрыкава,** «Урок філасофіі, альбо час сеяць і час прасейваць» (23.10) **Любові Чарнец з Барысава** і «Трэба глядзець дэтэктывы» (10.04. Прозвішча аўтара паведамлялася толькі для рэдакцыі).

На лічаныя балы ад гэтых гісторый адсталі бываліцы **спадароў Валерыя Гаўрыша з Чавусаў, Сяргея Кузняцова з Быхаўшчыны, Віталя Жураўскага з Жодзіна, спадарыні Таццяны Новік з Клецка** ды іншыя, якія ў мінулым, 2020 годзе не перамаглі.

Аднак конкурс *на найлепшую вясёлую і праўдзівую гісторыю,* як вы заўважылі, працягваецца. Журы — невялічкае, рэдакцыйнае ў складзе **першага намесніка галоўнага рэдактара газеты Наталлі КАРПЕНКІ, рэдактара аддзела Надзеі ДРЫНДРОЖЫК, і спецыяльнага карэспандэнта Веранікі КАНЮТЫ** працуе. Таму шанцы на перамогу па-ранейшаму застаюцца. Пішыце! Калі ласка, з нумарам тэлефонаў для аператыўнай зваротнай сувязі.

Загадзя з удзячнасцю,
Валянціна ДОЎНАР.

АД ЯЕ Ж і гэтым разам — парада. Паспрабуйце не выкідваць газеты з творамі, якія вам спадабаліся. Праз нейкі час (праверана) яны чытаюцца нібы ўпершыню і — што важна — да лепшага мяняюць настрой. Гэта — па-першае. Па-другое, на фінішы года вы пры жаданні зможаце вызначыць сваю дзясятку найлепшых гісторый і такім чынам стаць сябрам вялікага чытацкага журы, якое праз год, нароўні з маленькім, будзе падводзіць вынікі.

...Мы плануем, а бог смяецца? Так!.. Але ж хоць зрэдку, хоць калі-нікалі, пакуль жывём, будзем усміхацца і мы.

Падпіска-2021

Святы скончыліся, падарункі — пакуль што не!

Старыя правілы: каб пераканацца, што госць пайшоў, трэба спусціць яго з лесвіцы — то-бок праводзіць...
Каб паспадзявацца, што госць прыйдзе, трэба яго запрасіць. І «Звязда» гэта рабіла, прычым досыць часта: у прыватнасці, нашы падпісчыкі і дзелавыя партнёры прыходзілі на кожны розыгрыш прызоў.

Гэтым разам — на вялікі жаль і з-за вядомай прычыны — пасяджэнне тыражнай камісіі зноў прайшло без гасцей, хоць, вядома ж, паводле правілаў.

Згодна з імі, кожны, хто аформіў падпіску на «Звязду» на першы квартал альбо першае паўгоддзе 2021-га і даслаў на розыгрыш сваю карткукупон (яны друкаваліся цягам падпісной кампаніі разам з праграмай тэлепередач), мог прэтэндаваць на шыкоўную камізэльку і абагравальнік (як той казаў, «Ты адно запомні, браце, са «Звяздой» — цяплей у хаце!»)... Потым тут, у рэдакцыі, усе дасланыя карткі рэгістраваліся, сартаваліся па абласцях і горадзе Мінску, паасобку «ссыпаліся» ў наш чароўны саламяны капялюш і...

Днямі з яго дасталі шчаслівыя. Такім чынам:

Камізэльку жаночую выйгралі:

Віктаровіч Раіса Рыгораўна, г. Лунінец Брэсцкай вобласці;

Пілячынскі Уладзіслаў Вітольдавіч, в. Свіркі Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці;

Гаўрылавец Рыгор Сямёнавіч, аг. Мілашавічы Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці;

Ганевіч Іван Феліксавіч, аг. Дворышча Лідскага раёна Гродзенскай вобласці;

Тарасік Валянціна Станіславаўна, в. Шапялі Мінскага раёна;

Ахраменка Лізавета Антонаўна, г. Бабруйск Магілёўскай вобласці;

Камчыц Таццяна Віктараўна, г. Мінск.

Суперпрыз — маслены радыятар General Climate выйграла

Воюш Таццяна Іванаўна, аг. Багушэвічы Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці.

Віншуем! Хоць...

Трохі дзіўна, што на камізэльку больш пашчасціла мужчынам... Спадзяёмся, яны знойдуць каму зрабіць падарунак?

Такім чынам святы сапраўды скончыліся, а эстафета дабра і клопату — не!

Вас яна пакуль абмінула? Раім не засмучацца і, відаць, яшчэ раз нагадаем стары анекдот. Адзін дзядзька шторанак кленчыў ды Бога прасіў: дапамажы мне выйграць прыз ад газеты «Звязда»!.. Дапамажы мне...

Задурыў галаву, і Бог урэшце не вытрываў — адазваўся. Сказаў: «Паслухай, дапамажы і ты мне — падпішыся на гэта выданне, дашлі сваю картку...»

А калі не падпісаўся і не даслаў...

Высновы за вамі.

Афіцыйна:

Арганізатарам рэкламнай гульні «Звязда»: цёплыя словы, цёплыя назвы» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А, 220013, г. Мінск.

Рэкламная гульня «Звязда»: цёплыя словы, цёплыя назвы» зарэгістравана Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь 11.11.2020 года (пасведчанне № 3885) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 1 снежня 2020-га да 31 сакавіка 2021 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» на першы квартал або першае паўгоддзе 2021 года. Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 100 падпісчыкаў. Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.

Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў: 8 (017) 263 66 73.

«Амбарная кніга» ад Мальдзіса, пратаколы ад «Маладняка»...

Архіў як сродак супраць забыцця

«Гляджу на літар бісерны суплёт,
Чытаю лёс... То плачу, то смяюся.
Адзін лісток — як сведка, што народ
Не знік, не ўпаў, не змёр на Беларусі»

Гэта радкі з верша паэткі Ірыны Багдановіч, якім адкрываецца альманах «Аўтограф», выдадзены да 60-годдзя Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, якое прыпала на толькі што прамінулы год.

Сюды, у старажытны будынак на мінскай вуліцы Кірыла і Мяфодзія, прыходзяць навукоўцы, пісьменнікі, журналісты і ўсе, хто хоча дакрануцца да таямніц беларускай гісторыі, патрымаць у руках рукапісы і лісты славутых людзей, зразумець падаплёку падзей... Якія таямніцы гатовы адкрыць архіў у найбліжэйшы час? Пра гэта мы пагутарым з яго дырэктарам Ганнай ЗАПАРТЫКАЙ.

Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

— Рыхтаваліся адзначаць свой юбілей шырока, за годпаўтара пачалі рыхтавацца, але з-за пандэміі адбылося ўсё сціпла, у коле супрацоўнікаў, — уздыхае Ганна Вячаслававна. — Праўда, анлайн атрымалі шмат віншаванняў, быў устаноўлены экран, дзякуючы чаму да нашай урачыстасці далучыліся калегі-архівісты, пісьменнікі, вучоныя. Было і шмат публікацый, галоўны ж юбілейны праект — выданне альманаха «Аўтограф». Назва невыпадковая: у нашым архіве калісьці была насценная газета з такой назвай, яшчэ ў другой палове 1980-х, у ёй мы змяшчалі факты са штодзённага жыцця архіва. У альманаху адлюстраваная гісторыя стварэння архіва і яго фондаў — акцёраў Уладзіміра Караткевіча, Язэпа Пушчы, Адама Бабарэкі і многіх іншых. У раздзеле, для назвы якога ўзятае адметнае слоўца Адама Бабарэкі «уздалле», распавядаецца пра дакументы беларускага замежжа. У канцы мы змясцілі невялікую энцыклапедыю архівістаў «Нашы папярэднікі»...

— Вы згадалі «уздалле» Бабарэкі... Дасюль рэкамендую ўсім пазнаёміцца з двухтомнікам Бабарэкі, падрыхтаваным і выпушчаным вамі і Віктарам Жыбулем на аснове матэрыялаў архіва. Постаць Бабарэкі пацвярджае, што і сто гадоў таму на Беларусі былі мысляры і эксперыментатары еўрапейскага ўзроўню. Выхад двухтомніка стаў сенсацыяй... Нешта падобнае яшчэ рыхтуецца?

— Летась выйшла кніга дасюль не выдадзеных дзённікаў беларускіх пісьменнікаў ваеннага часу «Мы жылі ў будняхбарацьбы». Цяпер займаемся творчай спадчынай беларускага спевака Міхайлы Забэйды-Суміцкага, якому ў мінулым годзе споўнілася 120 гадоў. Вы можаце бачыць у кабінеце экспазіцыю, прысвечаную яму. Рэдкія дакументы — тыя, што датычацца яго знаходжання ў Маньчжурыі, у Харбіне, дзе спявак жыў да 1932 года. Вось поўны працоўны спіс — у якіх школах Харбіна ён выкладаў. Ён жа скончыў эканамічнае аддзяленне юрыдычнага факультэта — так называлася вышэйшая навучальная ўстанова ў Харбіне. Забэйда-Суміцкі быў практычны чалавек, думаў, калі не атрымаецца з операй, ці раптам, не дай Бог, голас прападзе — а ён жа хварэў часта, і на сухоты ў тым ліку, — будзе «запасная» прафесія. Захаваліся фота з яго архіву з дароўнымі надпісамі легендарных оперных спевакоў свету, з некаторымі ён пазнаёміўся яшчэ ў Харбіне — тады многія раз'ехаліся па розных сусветных тэатрах. Вось афішы ды іншыя дакументы, якія распавядаюць пра той перыяд, калі Забэйда-Суміцкі прыехаў у Мілан, дзе скончыў школу вядомага опернага спевака і педагога Карпі. На стэндзе пасведчанне пра гэта. З 1940-га Забэйда-Суміцкі жыве ў Празе, працуе ў Нацыянальным тэатры. У яго была мара — пераехаць на Беларусь. Яму садзейнічалі ў гэтым Рыгор Шырма, Максім Танк. У 1963-м годзе з іх дапамогай Забэйда-Суміцкі прыехаў з гастролямі ў БССР, даў вельмі шмат канцэртаў — ад Мінска да Брэста і Гродна. Вось фота музыкі з Караткевічам і яго жонкай. Але здарыўся 1968-ы год, падзеі ў Чэхаславакіі, і пераезд не адбыўся. У Чэхаславакіі, дзе абвастрыліся антысавецкія настроі, нават былі знішчаныя пласцінкі з запісамі беларускіх песень у выкананні Забэйды-Суміцкага, якога і па сёння там-сям за мяжой называюць «савецкі спявак».

— Я ведаю, што дакументы архіва выкарыстаныя і ў падрыхтоўцы выданняў да юбілею Уладзіміра Караткевіча...

—Так, якраз зараз у нас праходзіць выстаўка, прысвечаная малюнкам Караткевіча, дакладней, «амбарнай кнізе», як называў яе Адам Мальдзіс. У доме Мальдзіса захоўваўся бланк канцылярскай кнігі. Калі Караткевіч убачыў яе ў сябра, зрабіў на вокладцы надпіс: «Часопіс інвентарнага ўліку выпітага», там пачалі з'яўляцца жартоўныя запісы і малюнкі. Шмат малюнкаў увайшло ў 19-ы том збору твораў Караткевіча ў 25-і тамах, які выходзіць у выдавецтве «Мастацкая літаратура». Караткевіч вельмі пазнавальна рабіў шаржы — Барадулін, Прашковіч, Грынчык... Калі мы ўбачылі вось гэты жаночы партрэт, адразу пазналі: архівіст Яніна Кісялёва. А вось як уявіў Караткевіч сябе і сябра: «Помнік Мальдзісу і Караткевічу. Такімі нас будуць уяўляць нашчадкі ў 2068-м годзе». Гэткія антычныя атлеты...

— Вельмі нефармальная, так бы мовіць, кніга... Узяць карціну, як адзначалі пісьменнікі дзень ракетных войскаў: стол, над якім высоўваецца некалькі пар ног, адны — у жаночым абутку... І рэпліка нейкага Славічка, які пытаецца, а дзе дзядзі і цёці?

— Славічак — гэта сын Адама Мальдзіса.

— Дык вось, калі вы маеце справу з такімі артэфактамі, інтымнымі, не прызначанымі для публікі, ці ўзнікаюць нейкія этычныя абмежаванні?

—Ну, што датычыцца жартоўных малюнкаў Караткевіча, ён бы і сам выставіў усё, не задумваючыся. Да таго ж мы не рабілі гэтую выстаўку для шырокай публікі. З іншага боку, з цягам часу падтэксты, якія закранаюць канкрэтных людзей, знікаюць... Дый асяродак Караткевіча — людзі разняволеныя ў добрым значэнні гэтага слова. Яны ўмелі пасмяяцца з сябе. Такія камерныя, вельмі асабістыя дакументы могуць адкрыць шмат новага, патлумачыць аспекты біяграфіі, сяброўства... Напрыклад, калі Мальдзіс і Караткевіч жылі ў суседніх дамах, дык «пераміргваліся» лямпамі. Маўляў, прыходзь... Хіба можа выдумаць такую яскравую дэталь? Дай Бог сённяшнім пісьменнікам так сябраваць... Іх настроі перадае знакаміты малюнак «Шляхціц з паловай выдзертай барады». Хто вырваў яму тую бараду, і хто пад той барадой хаваецца, каго са сваіх знаёмых Караткевіч малюе — пакуль не высветлілі. Кніга з цікавай гісторыяй. Мальдзіс вёз яе, каб падарыць Аршанскаму музею, але не падарыў, і доўга потым жартаваў, чаму: «ззаду стаяла Запартыка і штурхала мяне, каб я аддаў кнігу архіву». Сапраўды, я ўгаварыла Адама Восіпавіча пакінуць рарытэт нам, у ягоным асабістым фондзе. Мальдзіс, дарэчы, вельмі ўзрадваўся, калі даведаўся, што мы зрабілі гэтую выстаўку. Ёсць у нас яшчэ адзін падобны альбом, яго прывёз з Рыгі мастак Вячка Целеш. Важыць той альбом, мусіць, каля дзесяці кілаграмаў. Там таксама шмат малюнкаў Караткевіча.

— Набліжаюцца два заўважныя юбілеі — Івана Шамякіна і Івана Мележа...

— Пра Шамякіна мы ўжо рыхтуем экспазіцыю. Па Мележы таксама будзе выстаўка, напэўна, яшчэ і віртуальная. Будзе матэрыял для часопіса «Полымя» на падставе дакументаў, якія раней не друкаваліся — маю на ўвазе не мастацкія творы, а даклады, выступленні. Вывучаючы фонд Мележа і Саюза пісьменнікаў, выявіла адно выступленне на 4-м пленуме Саюза пісьменнікаў СССР 1963 года, рукапіс якога адрозніваецца ад таго тэксту, што апублікаваны ў зборах твораў. У рукапісе згадваецца шмат прозвішчаў беларускіх пісьменнікаў — і ў крытычным, і ва ўхвальным сэнсе. Але чамусьці Мележ на рукапісе пазначыў для машыністкі: друкаваць без прозвішчаў...

— Ці часта сустракаюцца такія несупадзенні, і ці заўсёды варта вяртаць зробленыя купюры?

— Калі яны зробленыя ў адпаведнасці з меркаваннямі цэнзуры — вядома, трэба вяртаць. Што наконт рэдактарскіх правак — тут ужо іншае, гэта работа над стылем, якая часта ішла на карысць твору. Але ж бывала, што купюры ўзнікалі па тэхнічных прычынах — скажам, не ўлазілі ў старонку нейкі радок ці страфа... І са згоды аўтара тэкст скарачаўся. Гэта таксама трэба выпраўляць. Калі мы рыхтуем да выдання нейкі зборнік, звяртаем на гэта ўвагу. Для нас важны самы першы арыгінал, аўтограф. Вядома, пасля аўтографа можа быць машынапіс, перапрацаваны тэкст. Аўтограф можа быць толькі эскізам, задумай. А пасля аўтар мог садзіцца за машынку і працаваць над другім, трэцім варыянтам... Пасля твор трапляў у рэдакцыю ці выдавецтва, там працавалі рэдактар, цэнзура. Калі рыхтавалася выданне ўспамінаў Паўліны Мядзёлкі, відавочна па рукапісах, як нешта закрэсліў адзін рэдактар, другі, трэці... Мядзёлка не згаджалася, штосьці вяртала, ужо ў машынапісе. Урэшце яе ўспаміны «Сцежкамі жыцця» выйшлі ў вельмі абрэзаным варыянце. Яна і не дачакалася сваёй кнігі, не патрымала ў руках. Але ў архіве захаваўся поўны варыянт.

— Пра вядомых медыйных персон заўсёды шмат публікацый... А пра каго з незаслужана малавядомых вы збіраецеся згадаць?

— Думаю, што мы адзначым 120 гадоў Веры Андрэеўне Ніжанкоўскай, якая вельмі шмат зрабіла для беларускай культуры. Яе імя часцей за ўсё згадваюць у сувязі з Браніславам Тарашкевічам — яна яго першая жонка. Але Вера Андрэеўна — яшчэ і краязнавец, даследчык свайго радаводу, які бярэ пачатак ад Кукальнікаў — браты Кукальнікі яе блізкія сваякі. Паэт Нестар Кукальнік, аўтар лібрэта оперы «Іван Сусанін», альбо «Жыццё за цара», і вядомы цэнзар Павел Кукальнік. Яе бацька, Андрэй Снітка, гісторык-археограф, дырэктар царкоўна-археалагічнага музея ў Мінску. Вера Андрэеўна — родная пляменніца выдаўца Аляксандра Уласава, яе род мае сувязі з Канчэўскімі, Пузырэўскімі, з апошняй галіны выйшаў вядомы мастак. Каштоўнасць яе фонда вельмі высокая. Увогуле падчас работы над нейкай персаналіяй сустракаеш шмат цікавага «ўскоснага» матэрыялу... Напрыклад, у Забэйды-Суміцкага была настаўніца, спявачка Плотніцкая... Я пачала шукаць пра яе звесткі — а дзе пра спявачку XIX стагоддзя можна знайсці звесткі, як не ў часопісах і газетах, дзе рэгулярна друкавалі водгукі на спектаклі? Знайсці было нялёгка, бо Плотніцкая, відаць, страціла голас і сышла са сцэны, бо ў адной з захаваных рэцэнзіі так і гаварылася — «Плотніцкая сёння была не ў голасе». Дык вось, мяне ўразіла, што тэатральныя рэцэнзенты таго часу пісалі не толькі пра спектакль, пра кожнага выканаўцу, але заўсёды пісалі і пра гледача, як глядач рэагаваў, як сябе паводзіў. Калі хтосьці размаўляў падчас прадстаўлення, грукаў біноклем, не быў уважлівы, наконт гэтата з'яўлялася абураная крытыка. Глядач успрымаўся рэцэнзентамі як частка творчага працэсу.

— Ці будзеце вы працягваць праект, прысвечаны гадавіне «Маладняка»?

—Безумоўна. Гэты праект, у якім, акрамя нашага архіву, удзельнічаюць Выдавецкі дом «Звязда», Музей гісторыі беларускай літаратуры і Нацыянальная бібліятэка Беларусі, разлічаны да 2023 года, гэта значыць да стагоддзя легендарнага беларускага літаб'яднання. Самы актыўны ўдзельнік гэтага праекта — наш супрацоўнік, паэт Віктар Жыбуль. У альманаху «Аўтограф», напрыклад, змешчаны артыкул Жыбуля «Нявыдадзеная кніга «Супроць ветру» — выніковая праца Адама Бабарэкі пра Язэпа Пушчу: сімволіка назвы і праблема рэканструкцыі тэксту», а таксама артыкул пра фонд «маладнякоўца», напаўзабытага паэта Віктара Казлоўскага. Архіў наш мае добры досвед у даследаванні гісторыі «Маладняка» і «Узвышша».

— Як жа ён захаваўся — на фоне арыштаў маладнякоўцаў, знішчэння іх рукапісаў?

— «Маладняк» расфарміраваўся афіцыйна, а дакументы, паколькі гэта была зарэгістраваная ўстанова, пры ліквідацыі па законе мусілі быць перададзеныя ў архіў. Сёння такое ж правіла існуе. Вось дакументаў «Узвышша» няма — былі знішчаны, хоць мы вялі іх пошук. Захавалася частка ў архіве Адама Бабарэкі, у Нацыянальным архіве. А дакументы «Маладняка» перазахоўваліся ў былым архіве Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва, пад канец 1960-х былі перададзены ў архіў літаратуры і мастацтва. І было б няблага апублікаваць гэтыя жывыя, арыгінальныя дакументы з каментарыямі ў асобным зборніку. Пратаколы пасяджэнняў часткова выкарыстаныя ў зборніку Адама Бабарэкі, можна знайсці выпіскі з іх у многіх даследаваннях. Але поўнага зборніка матэрыялаў пра жыццё і дзейнасць «Маладняка» і саміх маладнякоўцаў няма. А там столькі цікавага!

— Вельмі важны і запатрабаваны атрымаўся б зборнік! А вось у рабоце з архіўнымі дакументамі здараюцца містычныя выпадкі?

— Так. Памятаю, як да нас прыходзіў слынны архівіст Віталь Скалабан, ён шмат працаваў з фондамі Гарэцкага, Зоські Верас, іншымі. І ўсё казаў: «Цікава, чый жа будзе фонд № 500?» Калі Віталь Уладзіміравіч памёр, нам перадалі ягоныя дакументы. І вось прыходзяць да мяне супрацоўнікі з аддзела захоўвання, прыносяць на подпіс паперы па прыёме дакументаў у навастворацы фонд Скалабана, і бачу я пазначаны нумар фонду — № 500. Неверагодна...

— Дзе ж яшчэ і адкрываць неверагоднае, як не ў фондах архіва літаратуры і мастацтва!

P.S. **Таму ўвага! У самым хуткім часе шукайце на старонках «Звязды» новую рубрыку — «Архіўныя гісторыі». У кожным выпуску Ганна Запартыка распавядзе вам пра сюжэты з унікальных фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва і пра неверагодныя артэфакты, якія можна там знайсці.**

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

ВАДОХРЫШЧА Ў РАДЗІВІЛАЎСКІМ СТАЎКУ

У старажытным Нясвіжы традыцыя акунання ў вадохрышчанскую палонку — новая, маладая: ну што такое адзінаццаць гадоў?.. Хацелася назваць гэты фотарэпартаж «Вадохрышча па-радзівілаўску», але гісторыя маўчыць пра тое, што гаспадары Нясвіжскага палаца купаліся ў час Богаяўлення. Таму сучасны Нясвіж таксама ідзе ў нагу з часам і пераймае новыя плыні і заводзіць новыя традыцыі. Вадохрышча на лёдзе Дзікага стаўка — так называецца одно з азёраў палацава-паркавага комплексу — з'явілася спачатку як ініцыятыва адной нясвіжскай сям'і, Ігара і Святланы Еўтухаў, а таксама іхніх сяброў як своеасаблівы Іардан, як далучэнне да хрысціянскага свету, для якога падзея Хрышчэння Ісуса асаблівы дзень рэлігійнага календара. А сем гадоў таму ідэю праводзіць рытуал асвячэння вады і купацца ў сцюдзёнай вадзе падтрымалі ўлады раёна, праваслаўная царква, далучыліся службы МНС, РАУС і райбальніцы, і прыватная ініцыятыва стала агульнагарадской і культурна-грамадскай. Сёлета, напярэдадні вялікага свята, хоць было даволі марозна (-20), на беразе Дзікага сабралася некалькі дзясяткаў апантаных і загартаваных нясвіжцаў, каб пахрысціянску адзначыць свята Богаяўлення і заканчэння Калядных свят. Была падрыхтавана і абсталявана купель з лядовым крыжам і ўпрыгожаная лампадкамі (таксама намаганнямі сужэнцаў Еўтухаў і іх сябрамі). Цырымонія асвячэння праводзілася не так, як у сталіцы і іншых вялікіх гарадах, — тут было ўсё па-свойску, па-кампанейску, быццам бы яна праходзіла таямніча і ў той жа час атмасферна. Купель асвятлялі фары аўтамабіляў, ліхтар пажарнай машыны і звычайнае вогнішча. Таму здымкі маюць мінімум каляровай гамы. Але падзея праходзіла ўзнёсла і душэўна. Протаіерэй і настаяцель царквы Георгія Перамаганосца Яўген Лабынько правёў чын асвячэння нясвіжскага Іардана і блаславіў на мацаванне душэўнага і цялеснага здароўя.

Усіх, хто знаходзіўся ў гэты вечар (а Вадохрышча праходзіць толькі напярэдадні вечарам), частавалі гарачай кашай і гарбатай па-нясвіжску.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец), в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н.М. извещает о проведении 18 февраля 2021 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20%), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб.
Условие продажи: 1. Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. 2. В соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %			
1	**Капитальное строение с инв. № 311/С-28433**, общей площадью **459,5 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **административное здание. Капитальное строение с инв. № 311/С-28063**, общей площадью **12,6 кв. м,** назначение – проходная, наименование – **здание проходной. Пристройки к проходной** (инв. № 1-796, инв. № 1-214)**. Погреб** (возле административного здания) (инв. № 1-795). **Благоустройство внутридворовое** (инв. № 1-355): асфальтобетонное покрытие **(площадка 1а)** – общей площадью **2 159,4 кв. м.** Благоустройство внутридворовое (инв. № 1-366) (тротуарная плитка – длина 64,0 м, ширина – 2,4 м). Ворота центральные (инв. № 1-793). **Забор железобетонный** (инв. № 1-794б). **Электроснабжение** (инв. № 1-730): АВВГ 3х35+1х10 – **60,0 м. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **320850100004000134** общей площадью **0,3065 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова М.Г., 46 (У-2)	**114 720,00**	5 736,00	11 472,00
